PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 24 (2457) Год XLVIII | Беласток, 15 чэрвеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Нястрашны Еўрасаюз

Пад такім лозунгам напярэдадні еўрасаюзнага рэферэндуму (31 мая і 1 чэрвеня) Беларускі самаўрадавы форум арганізаваў у Гайнаўцы канферэнцыю-абучэнне для сваіх самаўрадаўцаў. Польскія беларусы, як прадбачлівыя і практычныя людзі, не гулялі ў еўрасаюзную агітацыю — так ці інакш Польшча будзе сябрам ЕС і нам трэба пацягнуць з гэтага членства як мага больш карысці. Запрошаныя да ўдзелу радныя гмін Бельскага і Гайнаўскага паветаў мелі гэты факт данесці да сваіх выбаршчыкаў-гаспадароў.

На канферэнцыю склаліся шэсць дакладаў: Анатоля Ахрыцюка, бурмістра Гайнаўкі — гарадскія інвестыцыі за сродкі ЕС; Віялеты Алясюк, беластоцкі аддзел Фонду развіцця лакальнай дэмакратыі — дваццаць прычын быць у аб'яднанай Еўропе; Яўгена Семенюка, беластоцкі аддзел Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі — шанцы і пагрозы падляшскай сельскай гаспадаркі пасля ўваходу ў ЕС; Пятра Сельвесюка — выкарыстанне еўрасаюзных сродкаў у Бельскім павеце; Яўгена Вапы, старшыні Беларускага саюза ў Польшчы — сітуацыя беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы; Яраслава Матвеюка, факультэт юрыстыкі Універсітэта ў Беластоку — нацыянальныя і канфесійныя меншасці ў заканадаўстве ЕС.

Сельская гаспадарка ў першых гадах пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз пакарыстаецца непасрэднымі даплатамі. Галоўнымі патрабаваннямі — загаспадараная зямля і ўпарадкаваны юрыдычны яе статус (даплату бярэ ўласнік зямлі, а не той, хто яе абрабляе). Непасрэдныя даплаты маюць інвестыцыйнае значэнне, пасля пераходнага перыяду гаспадарка або пачне мэтанакіраваную вытворчасць і атрымае даплаты да яе, або ўвогуле страціць усякія даплаты.

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

А. Ахрыцюк і Міхась Андрасюк (старшыня Беларускага самаўрадавага форуму)

Яўген Вапа звярнуўся да радных з заклікам, каб пры ўсіх фінансавых карысцях, якія прынясе ЕС, не зводзіць саміх сябе адно да ролі ахоўнікаў нованасаджаных лясоў — бо тое, даказваў, нам і прапануюць: пасадзіце лес, мы вам за гэта заплацім, а вы сцеражыце яго. Паводле Я. Вапы, гміны замала ў сваёй дзейнасці карыстаюць і націскаюць на нацыянальную адметнасць гэтых земляў. Будзе прыкра і недаравальна, калі дэградуюць нас, нацыянальную меншасць, да этнічнай групы.

Аляксандр МАКСІМЮК

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Цісоўка. Марк Тышкевіч чытае „Вершы тутэйшыя" Міры Лукшы

З-над Нарвы — тутэйшыя — міжнародныя...

Ганна КАНДРАЦЮК

Міжнародны фестываль „Свет на абочыне", які ўжо чацвёрты раз арганізавала Літаратурна-мастацкае аб'яднанне „Карткі", з'яўляецца адной з самых цікавых культурных падзей у рэгіёне. У гэты раз у Беласток прыехалі госці з Сербіі і Чарнагорыі, Берліна, Сілезіі і Варшавы. Важным момантам фестывалю была прэзентацыя зборнікаў мясцовых літаратараў — журналісткі „Нівы" Міры Лукшы („Wiersze tutejsze") і Міраслава Грыкі з Рыбакоў Нарваўскай гміны („Opowiadania znad Narwi"). Мерапрыемства праходзіла ў Беластоку, Цісоўцы і Рыбаках, 30 і 31 мая г.г.

* * *

У першы дзень фестывалю запрэзентаваліся госці з Сербіі і Чарнагорыі — паэтка Даніца Паўлёвіч і празаік Горан Пайкіч. Аўтараў з Бялграда прадставіў паэт і перакладчык Лукаш Шопа, які прыехаў з Берліна. Сучасная сербская літаратура ўпісваецца ў кантэкст агульнасусветнай. У цэнтры чалавек і яго індывідуальны свет. Найбольшае зацікаўленне літаратурай праяўляе маладое пакаленне. Удзельнікі мелі нагоду паслухаць паэзію Даніцы Паўлёвіч найперш на сербскай, а пасля на польскай мове (у перакладзе Лукаша Шопы). Далей запрэзентаваліся Горан Пайкіч і Лукаш Шопа — паэт, якога друкавалі мы ў перакладзе на беларуска-падляшскую мову ў „Ніве".

Далейшую частку вечара запоўніў канцэрт культавага гурту Марка Галонзкі з сынамі. Бард з Алецка прыгадаў свае незабыўныя кампазіцыі на словы Эдварда Стахуры. Шэдэўры, як „Сёння банкет у артыстаў", спявала ўся зала ў кавярні „Фама". Першы дзень фестывалю зацягнуўся далёка за поўнач, а самыя зацятыя паклоннікі паэзіі маглі назіраць зацьменне сонца, якое пачалося ў 4^{35} раніцы (кульмінацыя ў 5^{25})) і працягвалася да 6^{25}.

* * *

Спецыяльна пад фестываль выйшлі з друку дзве кніжкі — „Wiersze tutejsze" Міры Лукшы і „Opowiadania znad Narwi" Міраслава Грыкі. Іх прамоцыя праходзіла ў Цісоўцы і Рыбаках, над рэчкай Нарвай. Кніжкі — з'ява ў літаратурным жыцці рэгіёна. Адлюстроўваюць адрэзак нашага беластоцка-польска-беларускага жыцця ў светлых і змрочных колерах. Прытым у „Тутэйшых" сустрэнем герояў вядомых чытачам „Нівы" — тут партрэты журналістаў, літаратараў, святара, мастакоў, сялян, прафесара, лінатыпісткі, музыкантаў... Герояў спалучае ніць талерантнасці і любові да роднага. Мірыны вершы на польскай мове і праз гэта здолелі ўразіць вялікую частку беластоцкіх літаратараў. „Тутэйшыя", узгадаваныя на культурнай глебе Вялікага княства Літоўскага і, як сама аўтарка, родам з бязмежнага памежжа: Цісоўкі, Бандароў, Нарвы, Ляхоў, Гайнаўкі, Бельска-Падляшскага, Гушчэвіны, Міхалова, Крывой, Катлоўкі, Ялоўкі, Рыбалаў, Маліннік, Рыбакоў, Тапалянаў, Гарадка, Таніцы, Баравых, Міклашэва, Мора, Зэльвы, Валілаў, Бандароў, Сакоў, Саколкі, Ярылаўкі, Раманава, Беластока, Крынак...

Вершы Міры чытаў акцёр Марк Тышкевіч на маёвым панадворку Багдана Дудко ў Цісоўцы.

[працяг ☞ 3]

Адкрыццё „Адкрытага праекта" ☞ 3

Мы, як Звяз беларускай моладзі, даўно ўжо думалі, што нешта трэба ў Гайнаўцы зрабіць, бо Бельск мае сваю „Бардаўскую восень", у Беластоку таксама бываюць канцэрты, а ў Гайнаўцы — нават Турнір беларускіх ліцэяў ужо не арганізуецца.

Леніна, Катынь, Смаленск ☞ 4

Польскім вучоным арганізатары канферэнцыі падрыхтавалі экскурсію ў Леніна, Катынь і Смаленск. Раней на месца бітвы пад Леніна прыязджала з Польшчы каля двухсот экскурсій у год. У мінулым годзе было толькі тры групы. Сучаснага абыякавага стаўлення да гэтай падзеі з боку палякаў не могуць зразумець мясцовыя апекуны мемарыяльнага комплексу.

Родам з Беласточчыны ☞ 5

Янка Геніюш нарадзіўся ў 1902 годзе 24 лютага ў Крынках на Беласточчыне. Дарэчы, у Крынках пачынаецца і ўвесь род Ларысы Геніюш, якая аб гэтым успамінае ў артыкуле „Крынкі" („Маладосць", 1997, № 1): „Казаў мой дзед Павел, што некалі прыйшлі туды ў пушчу два браты Мікалай і Міхал, якія і залажылі Крынкі. Ад Мікалая пайшлі Міклашэвічы, а ад Міхала — Міхайлоўскія — два старыя, адвечныя роды ў Крынках".

Белавежская самаўрадаўка аднавілася ☞ 8

Напрыканцы 2002 г. паявіўся лісток, які прадвяшчаў белавежцам адраджэнне іхняй газеты. Першы нумар новай газеты пад старым загалоўкам „Głos Białowieży" паявіўся ў лютым г.г. Галоўным рэдактарам стала Аніта Гвай — выпускніца гайнаўскага белліцэя.

Нясіце малітву ў сваіх сэрцах ☞ 9

Сабраныя перад храмам вернікі з вялікай прагай чакалі пропаведзі свайго настаяцеля а. Анатолія Такарэўскага, які нясе душпастырскую паслугу ў Арлянскім прыходзе з 8 жніўня 1962 года. Людзі паважаюць яго за сумленнасць, працавітасць і добрае кіраванне прыходам ды за сардэчныя адносіны да сваіх вернікаў.

Яднанне з прыродай ☞ 10

Прастора між Крушынянамі і Ласінянамі, якую калісь рупліва абраблялі нашы сяляне, ужо большай часцю запоўнена лесам. Ад дарогі між гэтымі вёскамі ў згаданы лес адыходзяць дарожкі. Даведаўся я, што некаторыя з іх вядуць да „збёрніка" з пляжам...

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Беларусь: краіна па дарозе

Напярэдадні сустрэч кіраўнікоў краін Еўрасаюза, ЗША і дзесяткі краін кандыдуючых у ЕС у Санкт-Пецярбургу з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным ды з удзелам лідэраў Супольнасці Незалежных Дзяржаў аб сітуацыі ў Беларусі, будучым супрацоўніцтве Польшчы і ЕС з гэтай краінай размаўлялі мы з міністрам замежных спраў РП Владзімежам Цімашэвічам.

— Польская ўсходняя палітыка ў адносінах да Беларусі апіраецца на прынцыпы ўмоўнасці. Таксама і Літва дэкларуе ахвоту прадстаўляння беларускіх інтарэсаў у Еўрасаюзе, пры выпаўненні ўмоў. Тым часам няма, здаецца, такога кіраўніка дзяржавы, які любіў бы, калі перад ім ставяць умовы.

— Фактычна, польскія прапановы што датычаць усходняй палітыкі, апіраюцца на гэты прынцып. Гаворым таксама аб індывідуалізацыі прапаноў у адносінах да ўсходніх суседзяў і этапнасці. Падкрэсліваем таксама неабходнасць дапамогі ў гаспадарчым развіцці, стварэнні інстытута адкрытага грамадства, дапамогі ў адукацыі. Ніхто ніякай дзяржавы і яго ўлад не прымусіць да супрацоўніцтва. Гэта ёсць умова, а ў выпадку Беларусі з гэтым праблема. Прамінанне часу аднак не без значэння. З гадамі відаць, што гэтая палітычная сістэма, хоць утрымліваецца, то і не ўкараняецца, хоць талерантна да яе адносяцца рахманыя, небунтоўныя беларусы, ды яе не кахаюць. Беларуская гаспадарка, якою кіруюць дзівосным чынам, яшчэ ў большых клопатах, чым шмат хто мог бы падумаць. Яна зусім несамастойная. Хопіць, што Расія зменіць сваю палітыку наконт паставак энерганосьбітаў, значыць, загадае плаціць за іх — і няма ўжо беларускай гаспадаркі. Усё затармазіцца. Штораз больш людзей гэта сабе ўсведамляе, што і форма камандавання сельскай гаспадаркай, як і брак адкрытасці на супрацоўніцтва са светам, асабліва з Захадам, каштуе цану аграмаднага ўбоства. Гэта непазбежна прынясе вынікі таксама ў палітычным аспекце.

— Ці ў якойсьці магчымай да прадказання перспектыве можна думаць аб пашырэнні Еўрасаюза на Беларусь?

— Прадпасылкай павінна быць незамыканне ЕС і прыняццё такой філасофіі, паводле якой кожная еўрапейская краіна, якая хоча і выконвае ўмовы членства, павінна мець такі шанц. У гэты момант шмат еўрапейскіх партнёраў не хоча аб гэтым і чуць. Пасля пашырэння Еўрасаюза ў будучым годзе на 10 краін, ёсць яшчэ план уваходу ў ЕС Балгарыі і Румыніі, адкрыта пытанне Турцыі. Трэба таксама знайсці разумную прапанову ў адносінах да балканскіх краін. Для шмат каго гэта зашмат рэвалюцыі, як на такі кароткі час, на найбліжэйшыя некалькі гадоў. Я асабіста не рэагую нервова на гэтую неахвоту да дыскусіі на тэму магчымага членства Беларусі ў ЕС, таксама і Украіны. Няма сумненняў, што праз некалькі гадоў сітуацыя адменіцца, калі перш за ўсё Еўропа „пераварыць" сваё пашырэнне і большасць еўрапейцаў зразумее, што гэта добра, і будуць псіхічна падрыхтаваны на размову аб далейшых кроках. У выпадку Беларусі, як і Украіны, дарога, аднак, далёкая, у больш за дзесяць гадоў. Аднак, такая перспектыва можа быць імпульсам для ЕС да пашырэння праграм супрацоўніцтва з гэтымі краінамі і перадачы большых сродкаў на яго фінансаванне. Мы будзем ісці ў гэтым напрамку і не робім тут ніякіх таямнічых мінаў.

— Ці пры такіх аграмадных адрозненнях у гаспадарчых і палітычных сістэмах Польшчы і ЕС ды Беларусі ўвогуле магчыма супрацоўніцтва?

— Праблемы не вынікаюць з палітычных цяжкасцей, хоць у Беларусі маюць значэнне, бо ўплываюць на гаспадарчыя канцэпцыі, хоць бы прыватызацыйную. Беларусы самі перашкаджаюць інвеставанню з замежжа. Гэта, сапраўды, абмежаванне. На штодзень, аднак, праблемай з'яўляецца ўзровень фінансавай рызыкі, звязанай і з бяспекай. Ніхто не інвестуе грошай без надзеі на прыбытак. З гэтага пункту гледжання Беларусь у горшым становішчы. Таксама з прычыны плыткасці таго рынку ўбогае грамадства. Але ўсё паказвае, што супрацоўніцтва ЕС з Расіяй будзе расці. З аднаго боку азначае гэта нейкую рызыку недаацэнкі супрацоўніцтва з Беларуссю ці Украінай. З другога, гэта і нейкая гаспадарчая логіка. Чым больш кантактаў з Расіяй — будзе патрэбны, напрыклад, развой транспарту. Відавочным стане для бізнесу тое, што краіны па дарозе, як Беларусь, павінны апынуцца ў кругу яго зацікаўлення.

Размаўляў Мацей Халадоўскі

Вывучаюць праблемы

У днях 29-30 мая г.г. у Беластоку адбылося 6-ае пасяджэнне Польска-беларускай каардынацыйнай камісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва. Пасяджэнне завяршыла прэс-канферэнцыя; на пытанні журналістаў адказвалі: намеснік дырэктара Дэпартамента еўрапейскай інтэграцыі і міжнароднага супрацоўніцтва МУСіА Польшчы Мацей Шыдлоўскі і эканамічны саветнік Пасольства Беларусі ў Варшаве Франц Доўнар. У адказ на нешматлікія пытанні можна было пачуць, што на месяц да ўвядзення Польшчай візавага рэжыму польскі бок настойвае на яго ўвядзенне, а беларускі — каб яго не было. Абодва бакі рашылі вывучыць праблемы, якія ўзнікаюць пры перасячэнні мяжы і запрапанаваць іх рашэнні. Яны таксама за тым, каб адкрыць новыя пагранпераходы, асабліва ў Белавежы і на Аўгустаўскім канале. Бо хаця ёсць праблемы, але і нейкі прагрэс таксама.

(ав)

Наступ на беларускасць

Аб гаротным стане беларускай мовы ў Беларусі сказана ўжо многа. На сённяшні дзень першую дзяржаўную мову краіны амаль немагчыма пачуць на вуліцах яе буйных і маленькіх гарадоў, у дзяржаўных установах і грамадскім транспарце, у магазінах і месцах адпачынку. Людзі ў Беларусі, у падаўляючай большасці, размаўляюць альбо па-руску, альбо на так званай „трасянцы" — мове надта „гарадскіх" вяскоўцаў, якія грэбуюць сваімі беларускімі каранямі, імкнучыся ўсё казаць на „правільном языке", але не здолеўшыя пазбавіцца беларускага акцэнту і не навучыўшыся рускім *г*, *ч* і *щ*, а таксама мяккаму *р*. І варта адзначыць, што сярод такіх „трасяншчыкаў" — большасць беларускага насельніцтва. Тлумачыць такую з'яву можна па-рознаму, але менавіта „трасянка" стала праяўленнем адносін гэтых людзей да беларускай мовы, у выніку чаго знікаюць школы і класы з беларускай мовай навучання, з'яўляюцца спробы аб'яднаць вывучэнне мовы і літаратуры ў адзін прадмет, а пра магчымасць набыць вышэйшую адукацыю на беларускай мове застаецца толькі марыць. Непаважнае стаўленне да роднага слова прывяло да такога ж стаўлення да роднай культуры, а таксама звычайнай культуры паводзін.

На фоне гэткай прыкрай рэчаіснасці астравамі ацалелай беларушчыны здаюцца некаторыя навучальныя ўстановы, дзе навучанне ідзе па-беларуску. Адзін з іх — Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй імя Я. Коласа. Ужо 11 гадоў ён пастаўляе Беларусі выдатна выхаваную маладую інтэлігенцыю, нацыянальная свядомасць якой становіцца вынікам руплівай працы неабыякавых да лёсу сваёй краіны выкладчыкаў, а адначасова стваральнікаў і кіраўнікоў гэтай установы.

Магчыма, з-за гэтага жылося ліцэю ўвесь час цяжка. То яго раптам міністэрскае кіраўніцтва спрабуе высяліць з будынка, то далучыць да педагагічнага універсітэта, пры гэтым пазбавіўшы значнай часткі самастойнасці. Але да апошняга часу гэтай найпрэстыжнейшай навучальнай установе ўдавалася неяк вытрымаць, ідучы на розныя саступкі. Адной з іх стаў фармальны пераход на пасаду намесніка дырэктара Уладзіміра Коласа, кіраўніка і стваральніка ліцэя. Дырэктарская пасада была на працягу некалькіх гадоў вакантнай. І вось яе запаўненне напрыканцы мая выклікала выбух гневу не толькі ў сценах ліцэя, а і далёка па-за імі.

Міністэрства адукацыі прызначыла на пасаду дырэктара жанчыну-педагога, якая не толькі, па яе словах, не ведала пра ліцэй, але і не валодае практычнай беларускай мовай. А менавіта на ёй там вядзецца ўвесь навучальна-выхаваўчы працэс. У выніку сітуацыя зайшла ў тупік — выкладчыкі, ліцэісты і іх бацькі адмаўляюцца прызнаваць новую дырэктарку, дасылаючы розныя лісты ў міністэрства і ўрад, а яна, у сваю чаргу, не жадае размаўляць з выкладчыцкім калектывам і вучнямі, заяўляючы, што будзе займаць сваё месца няхай нават пры дапамозе спецыяльных міліцэйскіх фарміраванняў. Пераходзіць у размовах на беларускую мову новы кіраўнік таксама не хоча.

Пакуль цяжка сказаць чым завершыцца канфлікт: пачынаецца лета — час канікулаў і адпачынку. Магчыма агульнымі намаганнямі ліцэістам і выкладчыкам удасца адстаяць беларускасць у ліцэі, альбо пераможа „дзяржаўная" лінія і многія з іх пакінуць яго. Але ўжо сёння бачна, што справакавалі скандал тыя, для каго чужое ўсё беларускае, а падрастаючае пакаленне і яго настаўнікі павінны толькі падпарадкоўвацца розным выбрыкам чыноўнікаў, без права быць пачутымі.

Уладзімір Лапцэвіч

Дзеля гаспадарчага супрацоўніцтва

6 чэрвеня, у рамках дзелавога візіту на Беласточчыну, у Маршалкоўскай управе адбылося спатканне прадстаўнікоў гродзенскага „малога бізнесу" з маршалкам Падляшскага ваяводства Янушам Кшыжэўскім.

Маршалак Кшыжэўскі пазнаёміў гродзенскіх гасцей з Падляшскім ваяводствам. Адзначыў ён, што наша ваяводства з'яўляецца культурным палігонам Еўропы. Галоўнай галіной вытворчасці з'яўляецца тут малочная прамысловасць — Падляшскае ваяводства пастаўляе трэць малака краіны. Шпаркімі тэмпамі развіваецца турызм, напрыклад у Белавежы за апошнія тры гады прыбыло каля трох тысяч начлежных месц. Да таго ж Польшча спадзяецца, пасля далучэння да Еўрасаюза, прыліву замежнага капіталу размерам каля 180 млрд. долараў. Маршалак Кшыжэўскі паінфармаваў таксама, што дасягнута дамоўленасць наконт адкрыцця чатырох чарговых пагранпераходаў між Польшчай і Беларуссю: у Ліпшчанах, Такарах, Ялоўцы і Белавежы.

Прадстаўнікі гродзенскіх прадпрымальнікаў паінфармавалі пра магчымасці дзейнасці ў іх замежных інвестараў, пра ўмовы гаспадарання ў Гродзенскай спецыяльнай эканамічнай зоне. Звярнулі яны таксама ўвагу на цяжкасці ў перасяканні польскай мяжы дзелавымі людзьмі; у Гродне дзейнічае Пагрансервіс, дзе можна заказаць нечарговы праезд цераз мяжу. Прамоўцы заўважылі і адсутнасць прамой чыгуначнай камунікацыі між Гроднам і Беластокам.

Маршалак Кшыжэўскі выказаў спадзяванне, што згаданыя пагранпераходы ўступяць у строй яшчэ ў гэтым годзе. Аднак неафіцыйна можна было пачуць, што афіцыйны Мінск не надта рады іх адкрыццю. Вось недалёка аднаго з іх, за Белавежай, знаходзіцца прэзідэнцкая дача і дзелавы ці турысцкі народ мабыць перашкаджаў бы Лукашэнку „саветавацца з народам"...

Аляксандр Вярбіцкі

Адкрыццё „Адкрытага праекта”

А яшчэ ўчора брат сказаў, што яму ў школе нудна, што нічога цікавага ў ёй не адбываецца. Сёння ён павінен адкруціць усе свае словы. Заходжу, а школа быццам і не тая! У малой галерэі дошкі, лесвіца, вядро, лапата, пясок, планы — словам — усё, што патрэбна будаўнікам. На старым цвіку вісіць табліца — „Увага! Працуюць!”. Каля раздзявальні інфармацыя: „Wygląd szatni i szafek świadczy o kulturze pracownika”. І ніякая гэта выдумка сантэхніка, і ніхто там папраўдзе не працуе. І ніхто не ведае, што сталася. Усе пытаюць, глядзяць адзін на аднаго, апускаюць рукі. Некаторыя падазраюць, хто тут аўтарам...

Так ці інакш, у нашай школе нічога не адбываецца без веды і дазволу дырэктара.

— Спадар дырэктар, хто нарабіў усяго гэтага на нашых калідорах?

Яўген Сачко: Гэта ініцыятыва Хрыстафора Ангельчыка, ён называе яе „Адкрытым праектам”.

— А што Вы думаеце пра гэты праект?

— Ён, безумоўна, адкрыты...

— Вы дазволілі правесці яго ў школе? Не перашкаджае Вам такі непарадак? Зрэшты, вучні падумалі, што гэта дырэкцыя павесіла гэты надпіс ля прыбіральні, пра паводзіны і культуру...

— Мне гэта вельмі падабаецца, што ты сказала: „Вучні падумалі”. І вось тое мы хочам дасягнуць!

Не ўсе ведаюць, які быў пачатак дзейнасці Хрыстафора ў нашай школе. А пачалася яна з „Бардаўскай восені” два гады назад... Па дарозе ў школу пабачыў я, што нешта не так, — расказвае Цыпа (ён жа Хрыстафор). — Вядома, можна ўвесь час прыклейваць адны і тыя ж плакаты тым самым пластырам, але ж можна зрабіць і нешта файнейшае, цікавейшае, больш прываблівае.

Мы, як Звяз беларускай моладзі, даўно ўжо думалі, што нешта трэба ў Гайнаўцы зрабіць, бо Бельск мае сваю „Бардаўскую восень”, у Беластоку таксама бываюць канцэрты, а ў Гайнаўцы — нават Турнір беларускіх ліцэяў ужо не арганізуецца. Дык думка ўвесь час была, але не было за што зачапіцца, бо чагосьці з нічога і мы не зробім. Пачалося з рэкламы „Бардаў”. Я ўжо тады казаў, што гэта больш чым звычайная рэклама, што гэта цалкам новы і адкрыты праект. Мабыць, будзем у ім рабіць таксама рэкламу, але праект — гэта значна больш.

— Якая сувязь паміж праектам і мэтамі ЗБМ, пашырэннем культуры, аб'ядноўваннем нестудэнцкай беларускай моладзі?

Х. Ангельчык: Тое, што напісана ў статуце Зьвязу — пашырэнне культуры і г.д., вельмі важна, але ж ЗБМ узнік таму, што нам не падабаўся свет і мы хацелі яго змяніць. Мелі хату і прыдумалі ў ёй нестандартна расставіць мэблю. Мы хочам увесь час раздражняць, ці, лепш сказаць, разварушыць людзей.

Зараз толькі пачынаем — „Адкрыты праект” яшчэ нічога не зрабіў, ён толькі — адкрыўся.

— Скажы тады, ці якраз такая пабудова павінна асацыявацца са Зьвязам, з беларускасцю? Якія ў гэтым „Праекце” беларускія матывы?

— Па-першае, гэта арганізуе Зьвяз беларускай моладзі. Ёсць беларуская паметка...

— Адна беларуская і дзесяць польскіх... А дзе ангажаванасць вучняў, аб'ядноўванне?

— А ці мне за імі ганяцца? Праект настолькі адкрыты, што я нікога ні ў чым не прымушу. Я хачу даць ім магчымасць. Хачу паказаць, што свет — гэта толькі такая дамова, і што яны могуць ад гэтай дамовы адвязацца ды спрабаваць заключыць яе нанава.

— А чаму якраз нанава? А калі нам свет падабаецца ў тым выглядзе, што зараз?

— Табе ўсё падабаецца?

— Падабаецца.

— Ну як табе можа падабацца? Зрэшты, наша пабудова вучням даказала, што ёсць нешта такое. Пасля Вялікадня мы ім пакажам, што гэта такое на самай справе. Пасеем траву, зробім выстаўку здымкаў, павесім плакат „Адкрытага праекта”. Растлумачым.

— І ўсё гэта — толькі адкрыццё? Дык дзе сутнасць? Што гэта такое „Адкрыты праект”?

— Гэта адкрыццё перад вучнямі новых, шырэйшых перспектыў, дарэчы, не толькі пунктаў погляду, але і практычных магчымасцяў. Можам запрашаць цікавых гасцей. Хочам зрабіць з моладдзю Беластока супольную фатаграфічную акцыю „Малыя мястэчкі”. Хочам зрабіць у школе сапраўдную галерэю, у якой вучні маглі б паказваць свае працы. Зможам не толькі пасядзець сабе, але самі папрацуем, чамусьці навучымся. Гэта на пачатак.

Так, гэта на пачатак, а ўсяго гэтага так шмат! Каб толькі „Адкрытаму праекту” сапраўды ўдалося зрабіць нешта больш практычнае за макет пээнэраўскай пабудовы. І каб не аказалася, што „Адкрыты праект” лепш за саміх вучняў ведае, чаго ім трэба. Каб ён не адмяніў майго свету, які і так мне падабаецца, у „Праектны свет”. Каб школа засталася школай, а „Праект” — усяго яе часткай. Шчыра кажучы, я уздыхнула з палёгкай, калі даведалася, што мэтай „Праекта” не толькі дзеянні тыпу „Мы зробім, а вучні хай сабе думаюць, што гэта такое”. Мабыць, з першапачатковага хаосу ўзнікне нешта канкрэтнае. „Адкрытаму праекту” мая шчырая падтрымка ў гэтыя першыя ягоныя дні.

Зося Лемеш

З-над Нарвы — тутэйшыя — міжнародныя...

[1 ☞ працяг]

* * *

У Цісоўку, вёску сваіх продкаў, прыехаў адзін з самых вядомых сучасных польскіх паэтаў сярэдняга пакалення — Яцэк Падсядла. Разам з ім паэты з Сілезіі: Кшыштаф Сліўка і Дарыюш Свентань. Вершы паэтаў, пад свіргат ластавак і мыканне кароўкі, чытаў Марк Тышкевіч.

З Цісоўкі, на аўтобусе, фестывальшчыкі падаліся ў Рыбакі. Міраслаў Грыка напісаў „Апавяданні з-над Нарвы” ў Рыбаках, роднай вёсцы бабулі, куды пасля смерці жонкі і маці пераехаў з Варшавы. Аўтар паказвае герояў без шанцаў. Запутаных у беспрацоўе, маразм, роспач. Проза Міраслава Грыкі напісана цёплай, сакавітай і жывой мовай. Натуральная ў ёй спагада герояў і талерантнасць. Не дзіва, — Міраслаў кажа, што плыве ў ім кроў пяці народаў. Аўтар з 1959 года нараджэння. „Апавяданні” лічыць сапраўдным сваім дэбютам.

Знаёмства з месцам і краявідам папоўнілі песні з-над Нарвы ў выкананні ніжэйпадпісанай, беларуска-канадскага сужонства Яны і Яна Кандрацюк-Брэуальт. На фестывалі „Картак” спявалі і гутарылі на дзевяці мовах: па-сербску, па-нямецку, па-ангельску, па-французску, па-арабску, па-беларуску, па-ўкраінску, па-руску ды па-польску.

Арганізатар і рэдактар „Картак” у адной асобе Багдан Дудко нездарма з'яўляецца першым героем „Вершаў тутэйшых”. Робіць ён справу, якой каштоўнасць у нас зразумеюць з часам.

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паэты ля Нарвы. Стаяць злева: Дарыюш Свентань, Лукаш Шопа, Кшыштаф Сліўка, Даніца Паўлёвіч. Ззаду: Яна Кандрацюк-Брэуальт і Горан Пайкіч

Леніна, Катынь, Смаленск

Хаця часта здараецца нагода пабываць у Беларусі, але выехаць на ўсход далей за Мінск удалося мне толькі двойчы. Пры канцы траўня г.г. Міжнародная акадэмія вывучэння праблем нацыянальных меншасцей і Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія арганізавалі канферэнцыю на мяжы Беларусі і Расіі, таму я вырашыў пакарыстацца запрашэннем, каб пабачыць амаль зусім невядомую мне частку рэспублікі. У мястэчку Горкі, у якім адбывалася канферэнцыя, галоўнай установай з'яўляецца ўспомненая Акадэмія, а горад у сапраўднасці — толькі дадатак да яе. З'ехалася некалькі дзесяткаў палякаў і расіян, усе чыталі даклады на сваіх мовах, палякі разумелі расіян, расіяне зусім не ведалі аб чым ім правяць палякі. А было б ім чаго паслухаць. Падчас банкета, які падрыхтавалі ўлады раёна і Акадэміі, з узаемаразуменнем было ўжо значна лепш. Тосты ўзносіліся бесперарыўна, а іх пераважная большасць датычыла „единства славянских народов". За „единство" славян падымалі кілішкі палякі, рускія і жыды так часта, што цяжка было паспець перакусіць паміж тостамі. Ветэраны навукі і партызанскага руху са Смаленска доўга не маглі развітацца з гасціннай беларускай зямлёй, на якой заставаліся яшчэ польскія таварышы і скрынка знакамітай „Пшанічнай".

Польскім вучоным арганізатары канферэнцыі падрыхтавалі экскурсію на месца бітвы пад Леніна, месца расстрэлу польскіх афіцэраў у Катынь і ў Смаленск. Раней, — расказваў прафесар Уладзімір Ліўшыц з горацкай Акадэміі, — прыязджала пад Леніна з Польшчы каля двухсот экскурсій у год. У мінулым годзе былі толькі тры групы. Сучаснага абыякавага стаўлення да гэтай падзеі з боку палякаў не могуць зразумець мясцовыя апекуны мемарыяльнага комплексу. Музей, месца славы, могільнік, асфальтныя дарожкі складаюць цэласную інфраструктуру для вялікіх святкаванняў. У час „польско-советской дружбы" пабудавалі ў пасёлку Леніна вялікі гатэль і рэстаран для абслугоўвання „товарищей из Польши". Цяпер нікому гэта непатрэбнае. Пару кіламетраў на ўсход за Леніна пачынаецца тэрыторыя Расійскай Федэрацыі. Хаця мяжы фактычна ніякай няма, але заўважаецца змена дзяржаўнасці. На тэрыторыі Беларусі канчаецца дарога, а далей у глыб Расіі вядзе нешта, што цяжка назваць камунікацыйным шляхам. Незасеяныя палі і хаты, якія можна пабачыць у нямецкіх дакументальных кінастужках перыяду акупацыі. Бедная Беларусь паказалася мне тады як зона дабрабыту.

Дваццаць кіламетраў ад Смаленска знаходзіцца мястэчка Катынь. Мемарыяльны комплекс пачалі будаваць там дзесяць гадоў таму. Дэмакратычная Расія брала на сябе адказнасць за лёс афіцэраў, якія трапілі ў савецкі палон у верасні 1939 г. Месца расстрэлаў прыкрытае каменнымі плітамі, а побач абгароджанае і ўпарадкаванае месца перапахавання палякаў немцамі ў 1943 г. На вялікай жалезнай пліце ўвекавечаны прозвішчы звыш чатырох тысяч забітых. Кожны з загінуўшых мае таксама бронзавую таблічку на каменным муры акружаючым гэты могільнік. Займае ён каля двух тысяч квадратных метраў. Экскурсавод, незвычайнай прыгажосці жанчына, паказвае дарогу да мемарыяла прысвечанага рускім ахвярам бальшавізму. Невялікія тры магілы з расійскімі і праваслаўнымі сімваламі. Пытаюся ў экскурсаводчыцы, ці гэтыя магілы з'яўляюцца месцамі расстрэлу жыхароў Смаленшчыны? У адказ пачуў, што ўвесь лес — звыш ста гектараў зямлі — гэта адна вялікая магіла. Дзе ні пачалі капаць, там ляжаць чалавечыя астанкі. Ніхто не ведае колькі рускіх закапалі чэкісты ў катынскім лесе — сто, дзвесце ці можа трыста тысяч. Ніхто таксама незацікаўлены выяўленнем гэтай таямніцы, ніхто не думае назваць ахвяр па імені і прозвішчы. Ніколі не дачакаюцца яны сваіх мемарыяльных дошак, паніхідаў, як палякі, якія пакояцца побач.

Смаленск вітае панарамай упрыгожанай храмамі XII стагоддзя. Цэнтр горада чысты, крамы поўныя, цэны прыблізна такія, як у Польшчы. Анатоль Корсак — дацэнт Смаленскага аддзялення Расійскай акадэміі навук паказваў горад не скрываючы ніякіх яго таямніц. Экскурсія вакол муроў горада, якія памятаюць літоўска-маскоўскія і расійска-польскія, расійска-французскія і расійска-нямецкія войны за гэтую крэпасць, што адкрывала дарогу на Маскву, стала нагодай для азнаямлення не толькі з гісторыяй, але таксама з сучасным расійскім грамадствам. Каля гістарычных вежаў кучы смецця, бруд і невыносны смурод туалетаў. Вечарам збіраюцца там маладыя людзі і месца вакол муроў становіцца цэнтрам спантаннага святкавання культу прыроды.

Квартал горада, што пабудаваны паміж усходняй часткай муроў і славутым Успенскім саборам, прадстаўляе сабой роспачны вобраз. Ні вуліц, ні тратуараў, ні агароджы панадворка. Слямсы прыкрытыя кавалкамі бляхі, шыфернымі плітамі і невядома чым там яшчэ. Уваход на царкоўны пляц гэта пераход да іншай цывілізацыі. Магутныя царкоўныя муры, пазалочаныя купалы, іканастас — сімвалы багацця імперыі паказваюцца вельмі кантрастнымі на фоне акружэння храма. Гэты горад, кожная яго вуліца, дом, патрабуюць гаспадара, інвестыцый, грамадства, якое хоча і чакае зменаў. Там няма нічога. Мільярды долараў атрыманых з продажу газу і нафты трапляюць у заходнееўрапейскія і амерыканскія банкі. Новыя рускія выкідаюць іх у гатэлях Мадрыда, Лондана, Парыжа, Фларэнцыі. Хапае пабыць пару гадзін на рускай зямлі, каб пабачыць, што ніхто ў гэтай краіне не думае пра народ. Гналі яго на нямецкія танкі і ў калгас, цяпер загналі ў пачуццё безнадзейнасці.

Выезд з Расіі ў Беларусь, са Смаленска ў Мінск, адбываецца шырокай дарогай, якая вядзе з Брэста ў Маскву. Тут выразна відаць пастарункі — мытныя і пагранічныя. Беларускія машыны прапускаюцца беспраблемна, усе астатнія расіяне яшчэ раз кантралююць. Па абодвух баках мяжы стаіць чарга аўтафураў. Там правяраюць аднак толькі дакументы. Зараз за мяжой, на тэрыторыі Беларусі за карыстанне дарогай небеларускім аўтамабілям трэба плаціць за праезд. Грамадзяне Расійскай Федэрацыі плацяць так як немцы, ці палякі.

Некалькі дзён пабыўкі на ўсходзе Беларусі ці захадзе Расіі стамляе людзей здэмаралізаваных цёплай вадой і чыстым туалетам. Аказалася, што прыняць душ у Беларусі можна толькі ў Мінску. Правінцыя паводле дзяржаўных улад вясной можа пачынаць купацца ў рэчках. Мінск аднак гэта не Беларусь, так як Масква гэта не Расія.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Таксама і Беларусь

Узняўся ўва мне дух з-за апошняга выступлення прэзідэнта Аляксандра Кваснеўскага ў час сустрэчы з Джорджам В. Бушам у Кракаве. І то перш за ўсё з-за аднаго матыву, а, папраўдзе, нават аднаго сказа. Вось, спадар прэзідэнт, успамінаючы аб неабходнасці адкрыцця Польшчы пасля яе ўваходу ў Еўрасаюз на краіны з-за ўсходняй мяжы, назваў таксама Беларусь. Слова „таксама" было, аднак, у кантэксце будучых адносін з Беларуссю, найважнейшае. Адасобіла яно гэтую краіну ад іншых пералічаных. Загучала, быццам прэзідэнт Кваснеўскі скарыстаў фразу „так, калі", значыць, з пэўнымі ўмовамі. І, пэўна, справа тут не толькі ў выконванні дэмакратычных прынцыпаў, свабоды слова і г.д., але таксама і ва ўжыванні прынцыпаў свабоднага рынку і ўсіх механізмаў з ім звязаных, ад прыватызацыі і дэманапалізацыі да празрыстага гандлёвага і супрацькарупцыйнага права (таго апошняга, дарэчы, і Польшча магла б сабе пажадаць).

Нашы будучыя адносіны з Беларуссю пачалі набіраць дадатковую меру пасля сустрэч правадыроў краін Еўрасаюза і дзесяткі кандыдатаў ды ЗША з Уладзімірам Пуціным у Санкт-Пецярбургу. У некаторых з гэтых сустрэч прынялі ўдзел лідэры Супольнасці Незалежных Дзяржаў. Адносіны тыя, як падкрэсліў м.інш. прэм'ер Лешак Мілер, выразна пацяплелі і наступіла збліжэнне ЕС і Расіі, а таксама, пасля іракскага крызісу, афіцыйна падтрыманы быў пункт погляду аб г.зв. стратэгічным партнёрстве паміж Расійскай Федэрацыяй і ЗША. Раней з выступленняў Джорджа В. Буша ў Кракаве можна было зразумець, што Польшча для ЗША, калі не самы важны, то адзін з найважнейшых саюзнікаў у Еўропе. Прытым дадаў ён, што Польшчы не трэба выбіраць паміж Еўропай і Амерыкай. І гэта, мабыць, праўда, але гледзячы хоць бы толькі на польскае суседства ўжо цяпер, перад уваходам у ЕС, польскія кіраўнікі стануць перад дылемай Заходняя Еўропа — Усходняя Еўропа, якраз дылемамі, а не выбарамі, бо толькі такі выбар разам з еўрасаюзнай акцэсіяй будзе. Асноўнай дылемай будзе ўтрыманне і развой гаспадарчых адносін з усім польска-еўрасаюзным баластам, хоць бы толькі трансгранічным. Маю на думцы перш за ўсё Беларусь...

Глядзеў я фрагментарычна афіцыйныя перадачы маскоўскага публічнага тэлебачання з пецярбургскіх сустрэч. Сярод прадстаўнікоў СНД заўважыў я прэзідэнтаў Украіны ды Грузіі. Прэзідэнта Лукашэнку не лавілі аб'ектывы маскоўскіх камер, ці што; прынамсі я яго не прыкмеціў. Можа, гэта выпадкова? А, можа, штосьці значыць? Можа, таксама, гэтае збліжэнне Расіі і Еўрасаюза ды захаванне стратэгічнага партнёрства Расіі і ЗША, а і польскія дэкларацыі наконт усходняй палітыкі, у кантэксце ўваходу ў ЕС, малююць магчымасць пералому ў польска-беларускіх і беларуска-польскіх суадносінах. Хочацца, прынамсі, у гэта верыць.

Мацей Халадоўскі

Беларус над Дунайцам

Калісьці апублікаваў я ў „Ніве" артыкул аб вядомым польскім арыянскім філосафе, напалову беларусе Андрэю Вішаватым (1608-1678). Цяпер знайшоў я трохі новых вестак пра яго бацьку Станіслава.

Гэты незаможны шляхціц герба Рох выводзіўся з мясцовасці Шумкі Падляшскага ваяводства і быў звязаны з арыянамі, якіх звалі яшчэ польскімі братамі. А на жыццё зарабляў ён як маёнткавы службовец у багатай арыянскай сям'і Морштынаў у Філіпкоўскім старостве былога Трокскага ваяводства або ў Янкаўцы пад Кракавам.

Абодва Вішаватыя — бацька Станіслаў і сын Андрэй — трымалі сувязь з адміністрацыяй арыянскага збора (храма) у Рамбковай на Дунайцы (каля Новага Сонча). Цераз Морштынаў, з якіх выводзілася Альжбета — жонка Фаўста Соцына (1539-1604), Станіслаў наблізіўся да самага віднага рэфарматара антытрынітарызму (руху, які супраціўляўся догме Тройцы) і пад канец 1605 г. ажаніўся з васемнаццацігадовай Агнешкай, адзінай дачкой Фаўста і Альжбеты. Ужо 14 лютага 1606 г. маладажон Вішаваты запісаў у гродскай управе ў Кракве г.зв. „рэфармацыю" — вызначэнне фінансавых правоў сваёй жонкі.

А вось пераклад дакумента з латыні: „Вішаваты жонцы сваёй рэфармуе. Прыйшоўшы асабіста перад управу і кракаўскія гродскія акты шляхетны (значыць, убогі шляхціц) Станіслаў Вішаваты з Шумак (...) заявіў: што шляхетнай Агнешцы Сацынянцы, жонцы сваёй сапраўднай 2 000 польскіх злотых, грошай абавязваючых у Каралеўстве Польскім, кожны з якіх мае па 30 грошаў польскіх, па прычыне сапраўднага і справядлівага пасагу, запісанага на сваіх рухомых і нерухомых маёмасцях усіх, спадчынных і заложаных, якія калі-небудзь былі ў мяне ў Каралеўстве Польскім, а таксама на грашовых сродках, якія калі-небудзь будуць у мяне, запісваю і рэфармую ёй вышэйзгаданае дабро разам з усёй юрысдыкцыяй, з уласнасцю, з усялякімі даброт гэтых прыналежнасцямі, а таксама з усялякамі даходамі і карыстаннем паводле права і абычаю іншых пасажных рэфармацый, якія звычайна захоўваюцца ў Каралеўстве". Адначасна абое, муж і жонка, якія ў прынцыпе выводзіліся з нацыянальных меншасцей, няблага распісаліся па-польску. Напрыклад: Jagnieszka Socynowna Wiszowata.

А цяпер некалькі каментарыяў. Гэты шлюб для Станіслава Вішаватага абазначаў някепскую фінансавую падмогу, бо яго родавыя ўладанні былі надта скромнымі. А за 2 000 зл. можна было купіць амаль 650 цялят або 2 000 карпаў. Сам Фаўст Соцын не быў багатым чалавекам і зрэшты не жыў ужо месяцаў дваццаць. Маці — з Морштынаў — памерла значна раней, але пасаг Агнешцы пэўна падрыхтавала багатая сям'я Морштынаў, якая, мабыць, і дазволіла свайму знаёмаму ажаніцца з Агнешкай.

У XVII стагоддзі ў Малапольшчы пісаць умела 5 працэнтаў жанчын, але найбольшы адсотак пісьменных прадстаўніц прыгожага полу наглядаўся сярод арыянскіх шляхцянак. Такім чынам подпіс маладой жонкі становіцца натуральнай справай, тым больш што яе бацька быў вядомым інтэлектуалам. Зрэшты, таксама ўсе дочкі Яна Каханоўскага былі „пісмачкамі", аднак адна з унучак „бацькі польскай літаратуры" Мікалая Рэя пісаць не ўмела.

І яшчэ адна цікавінка. Надмагільную пліту на магіле свайго цесця Фаўста Соцына ў Люславіцах на Дунайцы справіў пэўне Станіслаў Вішаваты, паколькі віднеюць на ёй першыя літары яго імя і прозвішча: S.W. Высечана на ёй таксама італьянскае выслоўе: „Хто сее цноту, пажынае славу, а сапраўдная слава перамагае смерць".

Вацлаў Урбан

Родам з Беласточчыны

Янка Геніюш

У лютым мінулага года споўнілася сто гадоў з дня нараджэння Янкі Геніюша (1902-1979) — беларускага доктара, бібліяфіла, палітыка, мужа паэткі Ларысы Геніюш. Але аб гэтым юбілеі ніхто не ўспомніў ні ў Беларусі, ні на яго Радзіме — Беласточчыне.

Сёння мне хочацца кампенсаваць гэтую недарэчнасць і прыгадаць нашага земляка такім, якім ён быў і запомніўся тым, хто яго ведаў. Па характару Іван Пятровіч быў розны — то спакойны, то занадта рэзкі і гарачы ў выказваннях, то чулліва-лагодны, то вясёлы. Але найперш да канца сваіх дзён ён быў і застаўся шчырым беларусам, патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Дый іншым Янка Геніюш быць не мог. Тым больш, што побач з ім, нягледзячы на ўсе пакуты, цяжкія і шматгадовыя ростані, была слынная паэтка Беларусі Ларыса Геніюш. Яны разам дзялілі свае гора і радасці, здзекі і хваляванні, трывогу і неспакой. На надмагільным помнічку ў Зэльве, які пры жыцці ставіла яму сама Ларыса Антонаўна (цяпер ім дваім творчая інтэлігенцыя Беларусі паставіла новы помнік на Зэльвенскіх могілках), былі выбіты такія радкі:

Па сонца асветы ўзлятаў, нібы птах,
З палоскі сялянскае, вузкае.
Адзін толькі ведаў у жыцці сваім шлях
Пачэсны, цяжкі, беларускі.

Янка Геніюш нарадзіўся ў 1902 годзе 24 лютага ў Крынках на Беласточчыне. Дарэчы, у Крынках пачынаецца і ўвесь род Ларысы Геніюш, якая аб гэтым успамінае ў артыкуле „Крынкі" („Маладосць", 1997, № 1): „Казаў мой дзед Павел, што некалі прыйшлі туды ў пушчу два браты Мікалай і Міхал, якія і залажылі Крынкі. Ад Мікалая пайшлі Міклашэвічы, а ад Міхала — Міхайлоўскія — два старыя, адвечныя роды ў Крынках". І калі Ларыса Антонаўна Міклашэвіч выйшла замуж за Янку Геніюша, то запыталася жартам у яго: „А дзе ж ты нарадзіўся?" — „Гдзе? У Крынках!" — адказаў Янка. І сапраўды... дзе ж яшчэ можна нарадзіцца на Беласточчыне, як не ў славутых Крынках.

З Крынак шлях ляжаў у Прагу, куды Янка Геніюш прыехаў вучыцца. Ён паступіў у Карлаўскі універсітэт, а пасля яго заканчэння атрымаў медыцынскую адукацыю, стаў урачом-венерологам.

У 1935 годзе Янка Геніюш ажаніўся з Ларысай Міклашэвіч (будучай паэткай Ларысай Геніюш). Гэта ён „першы даў мне (Ларысе Геніюш — С.Ч.) нашы кніжкі, адкрыў мне вочы на мінуўшчыну нашу і крыўды, якія мы цярпелі на нашай роднай зямлі. Чытаў мне Купалу" (Ларыса Геніюш, *Выбраныя творы*, Мінск 2000, с. 188-189).

У тым жа 1935 годзе ў сям'і Геніюшаў нарадзіўся сын Юрка. Пабыўшы два гады дома, Ларыса з сынам пераязджае ў Прагу да Янкі.

Жыццё ў Празе было вельмі цікавым і разнастайным. Тут жылі дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, беларускія спевакі, кампазітары, мастакі, пісьменнікі. З імі ўсімі быў знаёмы Янка Геніюш, з многімі шчыра сябраваў. А яшчэ ён быў актыўным сябрам пражскага камітэта Беларускай народнай самапомачы.

Падчас акупацыі Прагі нямецкімі войскамі, Янка Геніюш, „як старшыня сходу, падпісаў тэлеграму Адольфу Гітлеру ад «шчырых» беларусаў" (Барыс Сачанка, *Сняцца сны аб Беларусі*, Мінск 1990, с. 24). На самой справе ўсё адбылося інакш. Вось як пра гэта ўспамінае Ларыса Геніюш у сваёй „Споведзі". „Ермачэнка зачытаў тэлеграму Гітлеру ад нашага Камітэту (Беларускай народнай самапомачы — С. Ч.). Мы пачалі пратэставаць, што Камітэт самапомачы — арганізацыя апалітычная, не мае права даваць такіх тэлеграмаў. Ага, перад гэтым прыйшоў муж (маецца на ўвазе Янка Геніюш — С. Ч.), які на дадатковы тэлефон Ермачэнкі спяшаўся сюды з працы. Яму не далі яшчэ ні сесці, ні апомніцца, як ужо «выбралі» яго старшынёю сходу, і Ермачэнка пачаў чытаць тэлеграму. Я нічога яшчэ ў гэтым не разумела, а муж збялеў — ён бачыў подлы й хітры «ход» Ермачэнкаў... Тэлеграму акрэсліў Ермачэнка як ад «беларусоў у Празе» ці нейк гэтак. Напісалі пратакол сходу, але ніводзін з нас не падпісаў яго! Не падпісалі гэтага сведама... Самае тут цікавае тое, што хутка з кватэры Ермачэнкі згінуў архіў «Беларускага камітэту самапомачы ў Празе». Ермачэнка, як заўсёды, усміхаўся... І вось гэты архіў апынуўся ў Мінску, і паводле яго нас судзілі. Толькі там была зроблена яшчэ адна подласць — на непадпісаным пратаколе ўсе нашыя подпісы былі выведзеныя пад капіроўку"... (Ларыса Геніюш, *Споведзь*, Мінск 1993, с. 43).

Янка і Ларыса Геніюшы

У 1943 годзе ўсё той жа Ермачэнка адправіў Янку Геніюша ў Беларусь, у прыватнасці, у Слонім на лекарскую працу. Нядаўна Алег Лойка расказаў мне адзін цікавы эпізод з жыцця Янкі Геніюша ў акупіраваным немцамі Слоніме: „Падчас акупацыі ў 1943-1944 гадах мой бацька быў намеснікам слонімскага гебітартца (слонімскага райздрава), а гебіткамісаратрцам быў не хто іншы, як дзядзька Янка, спадар Іван Пятровіч Геніюш. Толькі па рэцэптах за подпісам майго бацькі выдаваліся ў слонімскай аптэцы лякарствы. Тыя лекі ішлі да партызанаў, і спадар Геніюш не мог таго не ведаць. А яшчэ Іван Пятровіч стаў героем у вачах майго бацькі, калі ён не ўскінуў руку дзеля прывітання слонімскага гебіткамісара Эрэна, п'ючы піва пры рэстараннай стойцы, калі ў рэстаран зайшоў Эрэн. Эрэн зрабіў на тое заўвагу, на якую дзядзька Янка зрэагаваў імгненна: «А хто тут гаспадар, мы ці вы?!» Праз некалькі дзён слонімскі арцтгэбіт узначальваў ужо не Геніюш: Эрэн прагнаў яго ў Баранавічы. Іншай меры пакарання Эрэн не дабіўся, бо за Геніюшам стаяла слава тых, хто падпісаў з Прагі ліст самому Гітлеру...".

Пасля вайны ў 1948 годзе Янка і Ларыса Геніюшы былі незаконна пазбаўлены чэшскага грамадзянства і з Прагі іх вывезлі ў Беларусь. А праз год асуджаны Вярхоўным судом Беларусі на 25 гадоў няволі.

У 1956 годзе Геніюшы былі датэрмінова вызвалены і вярнуліся ў Зэльву, дзе пасяліліся ў хаце бацькоў Янкі па вуліцы Савецкай, 7а. Сам Іван Пятровіч уладкаваўся працаваць доктарам у мясцовай зэльвенскай бальніцы. У іх хаце часта гасцілі Уладзімір Караткевіч, Алег Лойка, Данута Бічэль, Юрка Голуб, Алесь Траяноўскі, Мікола Канаш і многія іншыя пісьменнікі і сябры. Па-рознаму яны адносіліся да Івана Пятровіча, які пасля сталінскіх лагераў ненавідзеў камуністаў і савецкую ўладу, а яшчэ мацней любіў Беларусь і ўсё жыццё марыў аб яе незалежнасці ад Расіі. У 1963 годзе сям'ю Геніюшаў у Зэльве наведалі на новым „Масквічы" Уладзімір Калеснік, Янка Брыль і Уладзімір Караткевіч. Пра сустрэчу ў доме Геніюшаў і асабіста пра Янку Пятровіча Уладзімір Калеснік пакінуў успамін у сваёй кнізе *Усё чалавечае* (Мінск 1993, с. 74-75): „Гэта быў задзірысты інтэлігент, прывыклы да асабістага суверэнітэту пад парасонам чэхаславацкай канстытуцыі, дзе пражыў добрыя два дзесяткі гадоў. Любіў ён дражніцца з субяседнікамі, пазіраючы на іх зверху. Свой арышт пасля вайны і ссылку ў Сібір Іван Пятровіч лічыў гвалтам над асобай, парушэннем грамадзянскіх свабод, а ўласныя палітычныя акцыі, якія і ў Еўропе падлягалі крымінальнай, а не маральнай ацэнцы, таксама называў сваёй асабістаю справай. Ён заяўляў, што Заходняя Беларусь была вызвалена не ў верасні 1939 года, а ў чэрвені 1941-га. Так ён апраўдваў свой удзел у арганізацыі ганебна вядомага звароту беларускай эміграцыі ў Чэхаславакіі да Гітлера, — падзякі за акупацыю Маравіі і Беларусі вермахтам. Не адчуваў Іван Пятровіч і скрухі за тое, што прыехаў у час акупацыі ў Беларусь у афіцэрскім мундзіры вермахта як вайсковы ўрач. Адным словам, мы пераканаліся ў ходзе спрэчак, што наш размоўца прыпісвае сабе тую абсалютную непагрэшнасць, якою касцёл надзяляе папу рымскага ды і то ў моманты, калі той выступае ex katedra, гэта значыць, афіцыйна, урачыста. Іван Пятровіч сам сабе прысвоіў непамыльнасць і на ўсе выпадкі і ва ўсім. Спрачацца з ім было бессэнсоўна, і Брыль першы, а мы за ім, перайшоў да ігнаравання гаспадаровых задзірыстых выпадкаў. Застаўшыся без апанентаў, Іван Пятровіч перайшоў ад палітыкі да паэзіі і выказаў добрую памятлівасць, знаёмства са зборнікамі беларускіх паэтаў, якія купляў ці не ўсе падрад. Ён меў памяць і на імёны, і на хлёсткія словы, на парадоксы, аксюмараны, гіпербалы. Не дзівіўся я пазней, даведаўшыся, што нашпігаванаму палітыкай і лірыкай урачу не ставала часу, а мо нават і ахвоты на медыцыну. Гаворка пра паэзію зняла нашу некантактнасць, да гутаркі падключылася Ларыса Антонаўна, і мы шчыра пагутарылі пра літаратурныя клопаты-спадзяванні. Паэтка аказалася менш ідэалагічна закамплексаванай, чым яе муж...".

Гэта ўсё ж суб'ектыўная думка Уладзіміра Калесніка пра Янку Геніюша. Ды і не так часта ён з ім сустракаўся, гутарыў, спрачаўся. Больш шчыра пра Янку Геніюша расказаў у пісьме да мяне яго сябра са Жлобіна Мікола Канаш. Спадар Канаш вельмі часта наведваў Геніюшаў у Зэльве. І ўспомніць пра Янку яму было што: „Іван Пятровіч вельмі любіў беларускія кніжкі, сам шмат купляў, а таксама прасіў сяброў з другіх гарадоў. Калі я яшчэ жыў у Комі АССР, пасля лагераў, ён мне ў кніжнай лаўцы ў Зэльве падпісаўся на *Беларускую савецкую энцыклапедыю* і калі паступалі першыя тамы, дасылаў мне. Ён трымаў заўсёды сабаку, які быў прывязаны на ланцуг і ноччу бегаў ад ганку да хлява па нацягнутым дроце. Вельмі шкадаваў, калі не стала аўчаркі Альмы, якая была першым дэгустатарам цукерак, малочных прадуктаў, якія прыносілі суседзі. Усё гэта і стала прычынай смерці Альмы.

Іван Пятровіч працаваў лекарам у Зэльвенскай раённай паліклініцы, калі вярнуўся з Варкуты ў 1956 годзе. У яго кабінеце вісеў партрэт Францыска Скарыны, таму некаторыя хворыя пыталіся ў яго: „Хто гэта?". З усімі жыхарамі Зэльвы Янка Геніюш размаўляў толькі па-беларуску. Часам чуў, як хворыя, перш, чым трапіць на прыём да яго, казалі: „З лекарам гаварэце толькі па-беларуску, бо не дасць асвабаждзення". Тых, хто казаў яму „здравствуйте", Янка не чуў, а рабіўся глухім і нічога не казаў. А калі казалі яму „добры дзень", ён здымаў з галавы капялюш і шчыра вітаўся. Іван Пятровіч быў вопытны доктар-практык. Ён добра разбіраўся ў неўралогіі, сексалогіі, венерычны хваробах, быў нядрэнны хірург і тэрапеўт, ведаў лекавыя травы. Зэльвенцы яго моцна любілі і цанілі...".

19 лютага 1979 года Янкі Геніюша не стала. Ларыса Геніюш з вялікім болем у сэрцы напісала тады:

Апошні дотык рук на твары чую,
Тваіх знямоглых, цяжка схвараваных,
Апошні раз мой муж мяне цалуе,
З невысказаным да канца каханнем.
Залегла грозна цішыня у хаце,
Не вымавіць таго, што чуе сэрца.
Хвораму целу з ложка не падняцца,
Няўмольна смерць суровая крадзецца
Як воск ад свечкі, памаленьку тае
Малы агеньчык, ужо амаль не свеціць,
Смерць, быццам злодзей моўчкі падступае,
Што ж, усё яшчэ смяротнае на свеце...
О, колькі раз я на тваіх далонях,
Выплаквала свой горкі боль да рання,
Як затрымаць жыццё тваё мне сёння,
Усё не дасказана яшчэ, не дакахана.
Не адлятай у нязнаную дарогу,
Не пакідай, каб сэрца не балела,
Здаецца мне, што дзён гэтых нямнога,
Пражытых разам мігам праляцела...
Прайшлі гады, а для мяне хвіліны,
Супольных мараў, сноў аб Беларусі,
У нас дзве душы, а шлях наш быў адзіны,
Як цяпер сама я застануся?

Сапраўды, шлях у Янкі Геніюша быў адзін — гэта шлях да Беларусі. Ён кахаў і любіў Беларусь па-свойму шчыра, як любілі яе тысячы ягоных сяброў і равеснікаў. Дарэчы, пра многіх наш зямляк напісаў цікавыя ўспаміны. На жаль, яны раскіданы па прыватных і розных іншых архівах свету.

Сяргей Чыгрын

Зорка
старонка для дзяцей

Ніна Галіноўская

Лета

У сукенцы каляровай,
У хусцінцы васільковай
Ходзіць лета па палях,
Па расквечаных лугах.
Звоніць песняй жаўруковай,
Кожны дзень званчэйшай, новай,
Дбайна сонечнае лета
Спеліць ягады для дзетак.
Любіць з імі забаўляцца,
Загараць, спяваць, купацца.
Дораць лету дзеці ўсмешкі,
Гульні, песні і пацешкі.
І расчуленае лета
Дорыць ім букеты кветак.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Хрысціны" ў Цэнтры праваслаўнай культуры

Хрысціны ў Цэнтры

У беларуска-польскім садку зноў „ахрысцілі дзіця". Ідзе пра спектакль „Хрысціны", які ў дзень святога Мікалая (22 мая г.г.) у Цэнтры праваслаўнай культуры паставілі нашы сябры.

— Мы карыстаемся спадчынай і традыцыяй, — кажа дырэктар Луцыя Нігярэвіч. — Нашы спектаклі напісалі бацькі дзяцей, якія стварылі прадшколле.

Сапраўды, „Хрысціны" ўжо няраз мелі сваю пастаноўку ў мінулым. Аднак спектакль вытрымоўвае спробу часу і зараз яго пастаноўка атрымалася свежай і жывой. Цудоўна выступілі цяперашнія навучэнцы са сваімі бацькамі і настаўніцамі: Евай Гняздоўскай, Аннай Бабік, Альжбетай Рудчук і Данутай Тымашэвіч.

У ролю бабкі-павітухі ўвасобілася Ева Семянюк. Згодна беларуска-падляшскім павер'ям, прыказкам, прымаўкам і прымхам яна адукавала бацькоў (ролі іграліі Данута Якацюк і Андрэй Аляксейчык).

Прадшколлю шанцуе на галасістых бацькоў. У іх выкананні слухачы захапляліся старымі хрысцінымі песнямі (большасць іх запісалі ўдзельнікі XI Сустрэч „Зоркі" ў Дубяжыне і Студзіводах).

Акцёры пакарысталіся таксама старым сцэнічным афармленнем, які спецыяльна для спектакля падрыхтаваў Алег Кабзар. Настрой мацавалі народныя касцюмы — стылізаваныя на мясцовы ўзор кашулі і фартушкі вышывалі матулі.

— Чаму карыстаемся ўжо вядомымі п'есамі, — адказвае дырэктар прадшколля, — бо яны маюць свой непаўторны клімат і падабаюцца дзецям. У нас сем пастановак і ўсе хочам паўтарыць — двойчы ў год.

Зараз у беларуска-польскім садку ў Беластоку — 38 навучэнцаў, а на наступны год запісалася ўжо больш за 40 дзяцей.

Маладыя і старэйшыя акцёры запрасілі нас на наступныя сустрэчы. Што пасля „Хрысцін"? Вядома ж — „Купалле"!

Зорка

Бяроза

„Стаіць дрэва, колерам зялёнае, а ад гэтага дзерава — чатыры карысці: першае — хворым на здароў'е, другое — людзям калодзеж, трэцяе — ад цемры святло, а чацвёртае — састарэлым спавіванне". Што гэта за дрэва?

Бяроза. Парыцца ў лазні бярозавым венікам, гатаваць лекі з пупышак і лістоты — хворым на здароўе; наталяць смагу бярозавым сокам — людзям калодзеж; асвятляць жытло бярозавай лучынай, тапіць у печы бярозавымі дровамі — ад цемры святло; звязваць бяростай бітыя гаршчкі, чыніць кошыкі, берасцянкі — састарэлым спавіванне.

Бярозавы венік можа спатрэбіцца вам не толькі ў лазні, але і ў той час, калі вам не спіцца. Пакладзіце пад падушку бярозавы венік і вы забудзецеся пра бяссонніцу!..

У старажытных славян была галоўная багіня, маці ўсіх духаў і ўсяго багацця на зямлі — Берагіня. Яе шанавалі ў вобразе свяшчэннага белага дрэва — бярозы.

„Эўрыка"— гісторыя, адкрыцці, знаходкі, парады

Мая мама

Мая мама завецца Марыёля Федарук. Ёй 36 гадоў. Яна працуе ў Банку ПКО ў Бельску-Падляшскім. Мая мама вельмі прыгожая, у яе светлыя валасы і зялёныя вочы. У яе многа абавязкаў, але я стараюся ёй дапамагаць. Мая мама заўсёды кожнаму дапаможа. Яна вельмі мілая і каханая. Заўсёды мяне выслухае, дапаможа і прытуліць. Мая мама варыць найлепшыя абеды. Яна аб усім памятае, нават пра сабаку і рыбак. Я вельмі яе кахаю і не хачу замяніць на іншую маму.

З нагоды „Свята мамы" жадаю ёй радасці, усмешкі, поспехаў, менш праблемаў і самых сонечных дзён.

Марта Федарук, I „ц" кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Польска-беларуская крыжаванка № 24

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 20: Колер, парасон, раса, імя, шаманка, Іра, шоўк, аўтар. Шаша, карта, мора, ластаўка, п'еса, ролікі, марка, дзіця.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Пётр Паўлушэвіч**, **Ася Адамчык** і **Моніка Завадская** з Гарадка, **Галіна Ільяшук** і **Тамаш Хадакоўскі** з Нарвы, **Аня Андраюк** з Бельска-Падляшскага, **Дам'ян Мартынюк** з Новага Корніна. Віншуем!



Ля магіл беларускіх дзеячаў

Кожны чалавек пакідае на зямлі свой непаўторны след. Але не пра ўсіх людзей доўга памятаецца. Амаль кожнага ўспамінае сям'я, родныя. Дзеля гэтых успамінаў сваякоў-нябожчыкаў ёсць многа спосабаў, у тым і свята Радаўніцы.

Радаўніца, гэта свята з часоў язычніцтва. Род тады быў вельмі важным боствам — родапачынальнікам славян.

Радаўніцу святкуецца пасля светлага тыдня, у аўторак. У гэты дзень святочна апранутыя прыхаджане ідуць на могілкі. Калісьці магілу прыкрывалі абрусам, на які клалі чырвоныя велікодыя яйкі, пячэнне, цукеркі. Крыж перавязвалі вышываным ручніком. Цяпер людзі кладуць на магілу толькі крашаныя яйкі. Прыходзяць яны да сваякоў, каб чарговы раз падзякаваць продкам за іх жыццё, за ўсё тое, што яны зрабілі, а найважнейшае, каб разам з імі радавацца Уваскрэсеннем Ісуса Хрыста.

Памяць пра продкаў — ганаровая справа. Менавіта ў такі дзень — на свята Радаўніцы, якое выпала ў гэтым годзе ў аўторак 6 мая — наведала я са сваім I „а" класам Гімназіі і выхавацелькай Бажэнай Ляўчук, Міхалам Голубам і Аляксеем Харкевічам гайнаўскія могілкі.

Наведалі мы магілы дзеячаў Беларускага таварыства ў павеце і горадзе Гайнаўцы, настаўнікаў і працаўнікоў Ліцэя з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы, членаў беларускага хору пры Гайнаўскім доме культуры і расстраляных у час II сусветнай вайны.

Пра жыццёвы шлях некаторых дзеячаў расказалі нам нашы апекуны Міхал Голуб і Аляксей Харкевіч. Яны сказалі, што гэтыя людзі зрабілі важнае і годнае ўвагі. Наведалі мы магілы Кастуся Троца — арганізатара беларускай школы, Сяргея Харкевіча — настаўніка, Мікалая Дацэвіча — дзеяча, Эдуарда Вайсковіча — карэспандэнта „Нівы", Мікалая Нікалаюка — выпускніка белліцэя і дзеяча, Васіля Дзуна — настаўніка біялогіі, Элізы Кшэўскай — настаўніцы рускай і нямецкай моў, Аляксандра Іванюка — дырэктара белліцэя і настаўніка беларускай мовы, Уладзіміра Рушука — настаўніка фізікі, Макарыя Троца — стоража, Клаўдзіі Пшыходзкай, Галіны Панасюк, Пятра Гіншта — членаў хору і магілы вучняў белліцэя. Наведалі мы яшчэ магілы людзей забітых гітлераўцамі на акраінах Гайнаўкі ў 1942-1943 гадах. 32 асобы пахаваныя на праваслаўных могілках і 71 асоба — на каталіцкіх. Найбольш нам запамяталася сям'я Міранюкоў: Адам 33 — гады, Яўгенія — 33 гады, Юрка — 3 гады, Славік — 5 гадоў, Мірак — 7 гадоў і Ала — 9 гадоў.

Фота АЛЯКСЕЯ ХАРКЕВІЧА

Пры магіле былога дырэктара белліцэя Аляксандра Іванюка

Пабывалі мы і на могілках салдат Савецкай Арміі, якія загінулі ў баях за вызваленне горада Гайнаўкі і Гайнаўскага павета. Усюды мы запалілі знічы.

У падрыхтоўцы гэтага артыкула дапамог мне спадар Аляксей Харкевіч, якому шчыра дзякую.

Паўліна ІГНАЦЮК, I „а" кл. Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

Бобік і канікулы

Колькі часу марыла Анютка аб сваім сабачку! Хай нават зусім маленькім, беспародзістым, або шматпародзістым, як смяяўся тата. Але ці гэта быў бы сабака-медаліст, ці звычайны цюцька з закручаным абаранкам хвосцікам, трэба ім займацца. Сабаку ў горадзе нялёгка, асабліва калі жыве з сям'ёй у шматпавярховым доме. І не набегаешся на павадку, і не пашнырыш там дзе цікава ўволю. З чужымі дзецьмі не пагуляеш, з іншымі сабачкамі. А так, калі веснавы ветрык падзьме — кожны бег бы куды вочы глядзяць, цешыўся б жыццём... А і раніцай уставаць трэба, каб сабаку вывесці на вуліцу, і позна ўвечары... Вядома, што гэта не Анютка будзе рабіць, а тата ці мама. Дык тату гэта не даспадобы. Тата працуе. І мама працуе, і дома ўсё робіць, ды тата, мабыць, не так маміну працу бачыць, як сваю, і сваю стому таксама. Дык на маму, як заўсёды, пайшоў бы гэты абавязак — займацца і сабакам. І мама махнула рукою: а хай і будзе гэты твой, Анютка, цюцька.

Бобік, руды шчанючок, паводзіў сябе як кожны сабачы малеча. Прабаваў усяго, што трапіла пад зубы — смакавалі яму, здаецца, і абутак, і мэбля, і кніжкі, і дыван!.. Пасля паспакайнеў. Гэта было ўжо перад канікуламі.

Канікулы! Анютка ўсё запланавала. Спачатку — у лагер. Пасля — да бабулі ў вёску. І тата з мамай у гэты час ідуць у водпуск, раптам — у адзін час: у ліпені! А што з Бобікам?

— Трэба Бобіка адправіць у гатэль для жывёл на ліпень. А ў жніўні паедзе з Анюткай у вёску, — вырашыў тата.

— Ой, толькі не сумуй! — прытуліла Анютка сабачку. Той тужліва пазіраў на яе лупатымі вочкамі. І гуляць яму не хацелася, хоць гаспадынька кінула яму гумавую качку, на якую вельмі любіў „паляваць". Павалокся ў свой кошык, схаваў нос у лапах.

Сабраліся кожны на свае канікулы: Анютка ў лагер, тата з мамай на мора. А Бобіка завезлі ў шыкоўны гатэль. Там чысценькія сабакі і каты жылі і чакалі сваіх гаспадароў. Бобіку ўласнік гатэля даў акуратную будку з падворачкам, каб меў дзе бегаць, пару каляровых місачак на ежу і ваду. За сеткай жылі іншыя сабакі, усе пародзістыя. У іншым месцы канікулы мелі каты. У гатэль прыехалі на лета нават і папугаі ды канарэйкі!

— Кормім іх добра, — сказаў гаспадар гатэля. — І ветэрынар глядзіць, калі каторае захварэе.

Вядома, такія канікулы каштуюць. Заплаціў тата за Бобікавы „вакацыі" і кожны з сям'і раз'ехаўся ў свой бок.

Усе, і Анютка, і тата з мамай, вярнуліся загарэлыя і вясёлыя. А Бобік... І не галадаў жа ў гатэлі, і не хварэў, а схуднеў, а ягоная рудая як морква шэрстка зусім паблякла. Сядзеў асалавелы пад сваёй „дачай". І быццам здзівіўся, што па яго прыехалі.

— Мы ж цябе не пакінулі назаўсёды, Бобік! Паедзеш цяпер са мною да бабулі!

Сабачка яшчэ, здаецца, не верыў у сваё шчасце, калі ўся сям'я, разам, ехала на машыне дахаты.

Міра ЛУКША

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мартына

На сцэне „Роднага слова" ў Нараўцы выступіла Мартына Валерыян. Дзяўчынка прыехала з Бельска-Падляшскага. Яна вучаніца чацвёртага класа.

Мартына дэкламавала верш Станіслава Шушкевіча „Хворы жораў". Яе выступленне вылучалася ўражлівым пераказам зместу. Вельмі ўдала яна падабрала твор, ён быццам і спецыяльна напісаны для яе.

Мартына Валерыян лаўрэатка першага месца дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова 2003".

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Урок беларускай мовы ў I „б" класе бельскай „тройкі"

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Маладзёжны духавы аркестр

На культурнай ніве

Аб Чаромхаўскім ГОК

Гмінны асяродак культуры ў Чаромсе з'яўляецца каардынатарам культурна-асветнай дзейнасці на тэрыторыі гміны. Наглядае за вясковымі святліцамі ў Чаромсе-Вёсцы, Кузаве, Ставішчах, Вульцы-Тэрахоўскай, Баброўцы і насычальні. Карыстаецца трыма штатамі працаўнікоў (інструктар духавога аркестра працуе па дамоўленасці). ГОК — база для мастацкіх калектываў і сядзіба грамадскіх таварыстваў: любіцеляў народнай культуры, спартыўнага клуба „Калеяж" і Раённага праўлення Саюза польскіх пенсіянераў і ветэранаў. У клубе праходзіць большасць культурных мерапрыемстваў (або на пляцоўцы побач). Арганізуюцца тут сходы, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Для моладзі гэта месца гульняў і адпачынку. Клуб працуе ад аўторка да суботы ў гадзінах 8^{00}-20^{00}. У час імпрэзаў таксама ў нядзелі і панядзелкі.

На тэрыторыі гміны дзейнічаюць наступныя мастацкія калектывы: „Чарамшына", „Вульчанкі" ў Вульцы-Тэрахоўскай, калектыў у Чаромсе-Вёсцы, маладзёжны духавы аркестр, дзіцячы калектыў „Гілочка" і вакальна-інструментальны „Рэверс".

У ГОК працуе музычны гурток, у якім удзельнічае дваццаць курсантаў ахвотных іграць на піяніна і акардэоне. Маладзёжны духавы аркестр гуртуе дваццаць пяць асоб — вучняў пачатковай школы і гімназіі.

Да важнейшых цыклічных мерапрыемстваў належаць вечар калядак (студзень), фолькавыя сустрэчы „З вясковага панадворка" (двухдзённы фестываль у чэрвені), польска-ўкраінскія музыкальныя сустрэчы (ліпень), народныя фэсты (ліпень-жнівень), сямейны фэст з радыё „Jard" (жнівень-верасень), канцэрты мастацкіх калектываў з цыкла „Госці «Чарамшыны»".

Паспяховая праца гэта заслуга дырэктара ГОК Тамары Кердалевіч і кіраўніка калектыву „Чарамшына" Барбары Кузуб-Самасюк. Гэта ім ад грамадскасці Чаромхі належацца словы пашаны за прыемныя хвіліны праведзеныя на культурных мерапрыемствах.

Уладзімір Сідарук

Сябар „Нівы" з Нараўкі

Калі я запытаў у сваёй пісьманосіцы, хто ў Нараўцы рэгулярна чытае „Ніву", то даведаўся, што беларускі тыднёвік заўсёды выпісвае Міхал Панфілюк.

У пенсіянера Панфілюка за плячыма доўгае жыццё, яму 87 гадоў. Да пенсіі 27 гадоў працаваў ён пісьманосцам на пошце ў Нараўцы і распаўсюджваў „Ніву". Тады „Ніва" была танная, каштавала толькі 60 грошаў і мела мноства падпісчыкаў. Былі гады, калі Міхал Панфілюк разносіў больш за 100 экземпляраў газеты. За распаўсюджванне газеты пісьманосец атрымліваў пахвальныя дыпломы. Міхал Панфілюк мае свой невялікі газетны „архіў", у якім можна знайсці „Ніву" 20-гадовай даўнасці. Дзякуючы „Ніве" ён навучыўся чытаць па-беларуску, бо ў свае маладыя гады не меў такой магчымасці.

Сябар „Нівы" жыве ў Нараўцы з 1950 года, а сам паходзіць з вёскі Грабавец Дубіцкай гміны. Любіць ён чытаць карэспандэнцыі земляка Мікалая Панфілюка, хоць не ва ўсіх справах з ім згодны. Вельмі падабаюцца яму артыкулы Васіля Петручука — аўтара „Пожні". Дарэчы, гэтая кніга ў перакладзе на польскую мову знаходзіцца ў кнігазборы Міхала Панфілюка. Сталага чытача „Нівы" хвалюе таксама жыццё Нараўчанскай гміны.

Як хутка ляціць час! 50 гадоў назад Міхал Панфілюк быў войтам у Нараўцы. З таго часу ўключыўся ён у грамадскае жыццё гміны і цяпер упісаны ў кнігу заслужаных людзей для Нараўкі. У 1971 годзе М. Панфілюк атрымаў Кавалерскі Крыж Ордэна Адраджэння Польшчы. Мае таксама сярэбраную адзнаку „Заслужаны Беласточчыне". Шмат гадоў Міхал Панфілюк з'яўляецца членам Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы. На пабудову музея кожны год ён уплачвае 50 зл. Міхал Панфілюк гаворыць, што яму, як пенсіянеру, дапамагае жыць фізічная праца. Разам з жонкай Ульянай абрабляюць яны вялікі агарод, памагаюць сваім дзецям і ўнукам. Нягледзячы на гады, пенсіянер Панфілюк добра косіць траву ручною касой на агародзе. У вольныя хвіліны выплятае з ракіты прыгожыя кошыкі.

„Жыць — Радзіме служыць" — такі дэвіз пенсіянера Міхала Панфілюка з Нараўкі, вернага сябра „Нівы".

Мікалай Варанецкі

Белавежская самаўрадаўка аднавілася

„Głos Białowieży" — пад такім загалоўкам пачала выходзіць у кастрычніку 1996 г. самаўрадавая газета ў Белавежы. Яе першым рэдактарам быў Марэк Крыда, кіраўнік мясцовага прыватнага турыстычнага бюро. Потым яго абавязкі пераняла Альжбета Яблонская, працаўніца Белавежскага нацыянальнага парку, якая супольна з Лехам Навацкім, тагачасным дырэктарам Белавежскага асяродка культуры, выдаўцом газеты, паклапаціліся пра яе высокі ўзровень. Пасля адстаўкі Л. Навацкага з пасады дырэктара БАК „Głos Białowieży" апынуўся ў даволі нецікавай сітуацыі. Газета, праўда, выходзіла, але яе ўзровень надта панізіўся. У выхадных даных нейкі час не ўпаміналася прозвішча галоўнага рэдактара, бо і такога не было. Газету рэдагавалі супольна працаўнікі БАК. Неўзабаве абавязкі галоўнага рэдактара прыняла на сябе Нона Кур'яновіч, выконваючая тады абавязкі дырэктара БАК. Пасля яе за газету адказнай была бібліятэкарка Людміла Канэцкая. „Głos Białowieży" пратрымаўся з цяжкасцямі да канца 2000 года. Чарговыя два гады Белавежа не мела сваёй газеты, да якой белавежцы прывыклі і нецярпліва чакалі яе аднаўлення.

І, вось, напрыканцы 2002 г. паявіўся лісток, які прадвяшчаў белавежцам адраджэнне іхняй газеты. Першы нумар новай газеты пад старым загалоўкам „Głos Białowieży" паявіўся ў лютым г.г. Галоўным рэдактарам стала выконваючая абавязкі дырэктара БАК Аніта Гвай. Яна — выпускніца гайнаўскага белліцэя (1996 г.). У мінулым годзе закончыла Юрыдычнае аддзяленне Універсітэта ў Беластоку, а зараз яна працягвае адукацыю ў студыі аховы і прамоцыі культурнай спадчыны ў Інстытуце гісторыі Універсітэта ў Беластоку. У 1998 г. дэбютавала як паэтка. Піша таксама прозу.

— Праца з газетай для мяне справа зусім новая, — кажа Аніта Гвай. — Над першым нумарам сядзела я ўсю ноч. Раніцай хтосьці з навакольных жыхароў паведаміў паліцыю, што, мабыць, у будынак БАК нехта ўзламаўся, бо гарыць святло і хтосьці ў сярэдзіне ходзіць. Зараз я ўжо набыла вопыт і над камп'ютэрам начамі не сяджу. Думаю, што газета павінна быць штораз лепшай.

„Głos Białowieży" выходзіць тыражом у 200 экземпляраў. Друкуе яго Асяродак лясной адукацыі „Ягелонскае", які падлягае Надлясніцтву Белавежа.

Пётр Байко

Гайнаўскія пенсіянеры — людзі актыўныя

Актыўна працуе Раённае праўленне Саюза пенсіянераў у Гайнаўцы. Сёлета арганізавала яно павятовы песенны агляд салістаў, дуэтаў, тэрцэтаў і калектываў, якіх састаўлялі людзі ў пенсійным узросце. Мерапрыемства адбылося ў маі і прайшло надзвычай паспяхова. У гэтым вялікая заслуга канферансье Ядвігі Карпюк з Нараўкі і працаўнікоў Гайнаўскага дома культуры (ГДК).

Кіраўніцтва Саюза пенсіянераў ладзіць танцавальныя вечарыны ў ГДК, у „тартачнай" сталовай, у Старой Белавежы. І ўсе яны ўдалыя. Усе пад г.зв. жывую музыку (выконваюць яе таленавітыя музыканты з Гайнаўкі і Нарвы). 27 мая г.г. была такая вечарына ў ГДК. Старшыня Раённага праўлення Саюза пенсіянераў Мікалай Чыквін запрасіў пенсіянераў з Беластока, Дубічаў-Царкоўных і Нарвы. Адбылася сустрэча з павятовым абаронцам правоў спажыўца ў Гайнаўцы Марыяй Авярчук. Пасля ўсе танцавалі па 2-3 танцы ўзапар да 22^{00} гадзіны, пад гукі музыкі і спеву чалавека-аркестры жыхара Гайнаўкі. І хто скажа, што для людзей г.зв. трэцяга ўзросту забаўляльныя мерапрыемствы ўжо непатрэбныя! (яц)

Увага! Конкурс!

Вялікая Рада МГА Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына" запрашае прадстаўнікоў беларускай дыяспары да ўдзелу ў конкурсе на лепшы тэкст гімна нашай арганізацыі!

Музыка гімна „Бацькаўшчыны" была зацверджана на III з'ездзе беларусаў свету і запазычана са старадаўняга беларускага зборніка „Полацкі сшытак" (XVII ст.). Гэты твор быў апрацаваны кампазітарам Вячаславам Кузняцовым. Надыходзіць новы этап у стварэнні гімна „Бацькаўшчыны" — неабходны ўрачысты вершаваны твор, які стане тэкстам гімна і адкрые Чацвёрты з'езд беларусаў свету ў 2005 годзе.

Тэксты на конкурс гімна будуць прымацца да 31 снежня бягучага года.

Ноты выкладзены на сайце http://www.zbsb.org.

Патрабаванні да рытмаарганізацыі тэкста дадаюцца.

Інфармацыйны цэнтр
МГА ЗБС „Бацькаўшчына"

/_ _ /_ /_ _ /
/_ _ /_ /_ _ /_
/_ _ /_ /_ _ /
/_ _ /_ /_ _ /_ _/

/_ _ /_ _ /_ _ /
/_ _ /_ _ /_ _ /
/_ _ /_ _ /_ _ /
/_ _ /_ _ /_ _ /

/_ _ /_ /_ _ /
/_ _ /_ /_ _ /_ _/

750 гадоў пісанай гісторыі Бельска-Падляшскага

23 і 24 мая г.г. у Бельскім музеі адбылася міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 750-годдзю пісанай гісторыі горада. Беларускія і польскія гісторыкі прачыталі даклады на тэму Бельска, пачынаючы з паўстання горада (доктар Генадзь Семянчук з Гродна), цераз сярэдневякоўе, археалагічныя працы на Замкавай гары, збройныя сутыкненні з акупантамі (Анатоль Вап з Беластока), а закончыўшы на беларускім школьніцтве пасля II сусветнай вайны (Славамір Іванюк з Бельска).

Гісторыкі прадставілі таксама пытанні гарадскога самакіравання ў Бельску, царкоўна-прыхадскога школьніцтва ў канцы XIX і пачатку XX стагоддзяў, наблізілі біяграфіі вядомых у горадзе асоб і іх бельскіх родаў Кастыцэвічаў, Астасевічаў, Антыховічаў.

Першыя пісьмовыя весткі аб горадзе паходзяць з 1253 г. з Галіцкага летапісу (хаця некаторыя схіляюцца да таго, што з 1252 г. з Валынскага летапісу).

На працягу гадоў Бельск быў месцам барацьбы паміж мазавецкімі, рускімі, літоўскімі князямі, а нават крыжаносцамі. Горад некалькі разоў быў знішчаны. Першы раз Бельск спалілі татары ў 1240-1246 гг., калі адзін з камандзіраў Батыя знішчыў падляшскія гарады Драгічын, Сураж, Мельнік. Гісторыя паўтарылася яшчэ два разы ў 1259 і 1260 гадах. Амаль сто гадоў пазней — у 1377 г. крыжаносцы занялі і знішчылі амаль увесь горад, апрача замка, які занялі два гады пазней. Ад 1320 г. да Люблінскай уніі Бельск уваходзіў у саставу Вялікага княства Літоўскага.

Дзякуючы свайму палажэнню і гаспадарчаму развіццю Бельск, як другі горад на Падляшшы (першым быў Драгічын у 1409 г.), 9 студзеня 1430 г.

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Удзельнікі канферэнцыі перад Бельскай ратушай

атрымаў ад вялікага князя Вітаўта гарадскую прывілею, што ўзмацніла яго значэнне. Потым, у 1440 г. князь Уладыслаў надаў Бельску хэлмінскае гарадское права, якое паўтарыў кароль Аляксандар Ягелончык у 1494, 1499, 1501 гг., дзякуючы чаму горад атрымаў шэсць вясковых маёмасцяў і цераз гэта рынак збыту. Бельск развіваецца. Добрая зямля, карыснае палажэнне — на шляху з поўначы на поўдзень: з Вільні цераз Гродна, Бельск, Варшаву ў Кракаў і з усходу на захад: з Мінска цераз Ваўкавыск, Бельск, Варшаву, Кутна ў Познань — толькі ў гэтым памагаюць.

Цераз горад апрача ракі Белай праплывалі яшчэ Любка, Сэрэд і Крыніца. У канцы XVI ст. у Бельску было 794 дамоў, два касцёлы, пяць цэркваў, два шпіталі і пяць цэхаў: разнікоў, піваваў, кавалёў, краўцоў і гарбароў.

Важную ролю ў гаспадарчым і палітычным жыцці горада адыгралі шляхецкія соймікі. Найлепш вядомы сойм ад 1564 г., у якім прымаў удзел кароль Зыгмунт Аўгуст, архібіскуп гнезненскі Якуб Уханьскі, біскуп куяўскі Мікалай Вольскі, ваявода ланчыцкі Ян Серакоўскі, каштэлян гнезненскі Ян Таміцкі і каронныя паслы. У час сойма, 22 ліпеня, ад маланкі згарэў замак, а месцам правядзення соймікаў стаў Браньск. Пасля далучэння Падляшша да Кароны Бельск пачаў траціць сваю пазіцыю, а шведскі патоп знішчыў амаль цэлы горад. З ліку 830 дамоў асталося 48, а лік насельніцтва зменшыўся амаль утрая — з 3 350 да 1 260.

У XVIII ст. узнікае першая цагельня на Галавеску, якую заснавала Ізабела Браніцкая, якая пасля смерці мужа Яна Клеменса Браніцкага пачала адміністраваць горадам. Тады паявіліся першыя брукаваныя вуліцы, драўляныя тратуары, пабудавалі шпіталь, школу. Развіваюцца гандлёвыя кантакты з Гданьскам, Торунем, Варшавай.

Жыхары Бельска прымалі ўдзел у паўстанні Тадэуша Касцюшкі. У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Бельск трапіў пад панаванне Гагенцолернаў, а калі 26 студзеня 1796 г. рускія войскі пакінулі горад, увайшлі прусакі, пры якіх у горадзе ўзведзена было сем першых мураваных дамоў. У тым часе былі 24 вуліцы, 9 касцёлаў, цэркваў, манастыроў і 330 дамоў, 246 рамеснікаў і 4 купцы. Уваход французскай арміі ў 1807 г. закончыў панаванне прусакоў. Аднак у выніку палітычных „забаваў" Напалеона і цара Аляксандра горад быў далучаны да Гродзенскай губерні.

Да 1830 г. польская мова была галоўнай у школах, але пасля Лістападаўскага паўстання пачаліся рэпрэсіі і ў 1840 г. руская стала мовай выкладання.

Першая сусветная вайна давяла да таго, што амаль 50% жыхароў падалося ў бежанства. Немцы пакінулі горад 19 лютага 1919 г. У міжваенны перыяд Бельск пачаў паволі развівацца. Паўставалі млыны, цагельні, малачарні, пякарні, школы. Разбудаваны быў шпіталь. У 1938 г. працавалі ў Бельску 32 лекары, 15 зубных урачоў і 14 аптэкараў. А потым зноў ваенная завіруха... Нямецкая акупацыя, экстэрмінацыя жыдоў, масавыя экзекуцыі, бамбардзіроўкі, знішчэнні і так аж да 30 ліпеня 1944 г., да вызвалення Чырвонай Арміяй. Затым адбудова горада, новыя ўлады, новая, пасляваенная рэчаіснасць...

Так у вялікім спрашчэнні выглядала гісторыя Бельска-Падляшскага, аб якой гаварылі гісторыкі з выпадку 750-годдзя пісанай гісторыі горада.

Паўліна Шафран

Нясіце малітву ў сваіх сэрцах

21 мая Орля ўрачыста адзначыла прыхадское свята апостала і евангеліста Іаана Багаслова, якое ў народзе называюць папросту Іванам. Рынак мястэчка запоўніўся святочна апранутымі людзьмі, якія, як заўсёды, праводзілі свята на свой лад: адны святкавалі пры ларках, другія пры піве ў краме, іншыя ў парку, больш адухоўленыя — на цвінтары, а найбольш набожныя маліліся ў царкве. Паветра што і руш пранізвалі гукі свісцёлак і трубак, гудзелі выстралы дзіцячых пісталетаў ды ўзрывы петардаў — угару з дымам і шумам узляталі грошы. А ў Свята-Міхайлаўскай царкве адбывалася набажэнства. Перад храмам кленчыла некалькіх жабракоў. Усе ў той дзень — хто як мог і хацеў — ушаноўвалі свята.

Да свята Орля нарыхтавалася рупліва, адно толькі з надвор'ем не пашанцавала — было холадна і хмарна. Перад святам быў папраўлены выгляд цэнтра мястэчка. На месцы агіднага аўтобуснага прыпынку (пра яго нядаўна пісала „Ніва") паявілася новая павець пад бляхай; да таго ж незваротна ліквідавалі публічную прыбіральню. Звонку была абтынкавана гэсаўская крама (уласнасць гміны), былі памаляваны краі тратуараў, а ў парках — адпачынковым і дзіцячым — выкасілі траву. Жыхары папрыбіралі тратуары перад сваімі сядзібамі.

Прыезджыя лічаць Орлю мясцовасцю чыстай. Многа тут змянілася: усё цікавей устройваюцца прысядзібныя агародчыкі, многа кветак і дэкаратыўных дрэў. Орля за некалькі гадоў перастала быць прамысловай мясцовасцю, цяпер перастае быць і сельскагаспадарчай, а становіцца ўсё больш ціхай, быццам адпачынковай сабе — дзе большасць насельніцтва складаюць пенсіянеры і беспрацоўныя — але, на жаль, нецікавай турыстам і інвестарам.

Святочны дзень прыцягае ў Орлю навакольных людзей, аднак, — як я заўважаю — для масавага святкавання выходзіць штораз менш людзей. Калі я стаў цікавіцца, чаму так дзеецца, дык людзі мне адказвалі, што грамадства збяднела, што Івана выпала пасярэдзіне тыдня і людзі звонку не хочуць пакідаць працу, ды, наканец, дрэннае надвор'е. А некаторых людзей для выхаду з хаты змабілізаваў бы прыезд мітрапаліта ці епіскапа. З тае бяды адно тое добрае, што ў гэты дзень не бачна столькі п'яных як калісь, калі людзям хапала і працы, і грошай.

Сёлета было сціпла, значыць, было менш прыхаджан, гасцей і духавенства, але — як заўсёды — узнёсла і ўрачыста. Святую літургію служыла больш дзесяці святароў і дыяканаў з суседніх прыходаў. Пасля хрэснага ходу і праспявання „Многая лета" пропаведзь са ступенькаў храма сказаў бельскі настаяцель а. Лявонцій Тафілюк:

— Дарагія браты і сёстры! Сёння, у дзень перапалавення Пяцідзесятніцы, мы прыносім малітвы апосталу і евангелісту Іаану Багаслову. Няхай Гасподзь ахоўвае вас многія гады і няхай гэтае свята як найдаўжэй астаецца ў вашай памяці, у вашых сэрцах. Ніколі не лічыце, што пасля малітвы ў храме ці дома, малітва закончана. Мы молімся пастаянна і таму, калі вы адыдзеце адгэтуль, нясіце малітву ў сваіх сэрцах, каб заўсёды быць з Богам і каб Бог быў з вамі!

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Сабраныя перад храмам вернікі з вялікай прагай чакалі пропаведзі свайго настаяцеля а. Анатолія Такарэўскага, які нясе душпастырскую паслугу ў Арлянскім прыходзе з 8 жніўня 1962 года. Людзі паважаюць яго за сумленнасць, працавітасць і добрае кіраванне прыходам ды за сардэчныя адносіны да прыхаджан, якіх — як сам прызнаецца — усіх ведае і хвалюецца разам з імі іх радасцямі і смуткамі. Айцец Такарэўскі таксама прыгадаў жыцце апостала і евангеліста Іаана Багаслова ды падзякаваў вернікам і духавенству за памяць і ўдзел у прыхадскім свяце, за сумесную святочную радасць і пажадаў усім бодрасці духа і стойкасці ў сваёй праваслаўнай веры.

Міхал Мінцэвіч

Пакручаны лёс

Барбара Панфілюк (дзявочае Леанюк) нарадзілася ў 1922 годзе ў Грабаўцы каля Дубіч-Царкоўных у небагатай сям'і. Яе бацькі, Юсіп і Тэкля, якія мелі яшчэ больш дзяцей, стараліся, працавалі і былі сумленнымі і набожнымі людзьмі. Калі восенню 1939 года прыйшлі саветы, людзям здавалася, што будзе лепш, аднак хутка апякліся савецкім раем і пераканаліся, што камуна, гэта ілюзія і пераліванне з пустога ў парожнае. Пасля нападзення гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз настаў цяжкі час акупацыі.

Варку і некалькі яшчэ асоб з вёскі восенню 1943 года назначылі на працу ў Нямеччыну. Фурманкамі завезлі іх у Бельск-Падляшскі, а адтуль у таварных вагонах павезлі далёка на поўнач, у нейкую мясцовасць пад Кёнігсбергам. У вялікай зале чакалі іх нямецкія гаспадары.

Варку забраў гаспадар з вёскі Ківітэн; меў ён невялікую гаспадарку, на якой трымаў дзве каровы, двое коней, чатыры свінні і за дзесятак курэй і качак. Гаспадар той незадоўга да прыезду Варкі вярнуўся з усходняга фронту, дзе ў час баёў страціў цэлую далоню. Была ў яго прыгожая жонка і чацвёра маленькіх дзетак. На гаспадарцы працаваў яшчэ палонны француз. Гаспадарка была невялікая, больш бедная чым багатая, аднак усё было дагледжана. Гаспадар і гаспадыня былі добрымі людзьмі і да сваіх падначаленых адносіліся як родныя бацькі і добра кармілі сваіх работнікаў. Недалёка быў яшчэ вясковы пункт прыёму малака, дзе працуючыя там варшаўскія дзяўчаты прапанавалі сыр і масла, але ў Варкі не было патрэбы карыстацца гэтым.

У іншым маёнтку, адлеглым каля 30 кіламетраў, працавала Ганна Беразняк, таксама з Грабаўца, якая ў Германію ехала ў адным вагоне з Варкай; Варка часта яе наведвала, бо добры гаспадар дазваляў на гэта. Так мінуў год, але, як гавораць, добрае хутка прамінае.

Восенню 1944 года Варку пагналі капаць акопы каля Кёнігсберга. Пасля некалькіх тыдняў завезлі яе поездам на поўдзень, недзе пад чэшскую граніцу. Там працавала ў зброевай фабрыцы, чысціла карабіны. Кармілі там вельмі слаба і работнікі былі больш галодныя, чым сытыя. Адчувалася там прыбліжэнне фронту, бо часта праляталі амерыканскія і англійскія самалёты і чутны былі ўзрывы снарадаў і бомбаў.

У пачатку красавіка 1945 года прыйшлі амерыканцы; былі гэта культурныя і добрыя людзі, якія ўдоваль кармілі вызваленых вязняў. Ад іх ніхто не пачуў дрэннага слова. Неўзабаве амерыканцаў замянілі рускія, якія паводзілі сябе зусім інакш. Усіх вязняў павезлі ў Савецкі Саюз; Варцы давялося пабываць у Ковелі, Гродне і іншых гарадах, дзе наглядзелася на жах і беспарадак.

Пры Божай дапамозе Варцы ўдалося вярнуцца дадому пасля Пакровы 1945 года. А ў мясніцы 1946 года выйшла яна замуж за свайго аднавяскоўца, які таксама вярнуўся з Нямеччыны. Мо 15 гадоў таму перабраліся яны ў Дубічы-Царкоўныя, муж Варкі не дажыў нашых дзён і яна жыве цяпер сама; адна яе дачка, Маня, жыве ў Дубічах, а другая, Ніна, у Грабаўцы.

Мікалай Панфілюк

Як Міхал Вапа загад вазіў

Падчас Студзеньскага паўстання 1863 г. стратэгічна важным аб'ектам з'яўлялася Белавежская пушча. Як для расійскай адміністрацыі, так і для інсургентаў. Не дзіва, што абодва бакі планавалі запанаваць над лесам. Да канца мая расійскія службоўцы паведамлялі аб адносным спакою ў дадзеным рэгіёне. Яшчэ 25 чэрвеня штабс-капітан Штральборн, тагачасны начальнік Белавежскай пушчы, інфармаваў гродзенскага вайсковага губернатара Уладзіміра Бобрынскага, што ў Белавежскай пушчы паўстанцаў няма. Праўда, казённыя сяляне з вёсак размешчаных унутры і вакол пушчы ўсё часцей не падпарадкоўваліся лясной адміністрацыі. На заклікі спыніцца і падпарадкавацца мужыкі адказвалі, што зараз вайсковы час і яны могуць рабіць, што пажадаюць. З гэтай прычыны пашырыліся на тэрыторыі Белавежскай пушчы пажары.

Толькі пры канцы жніўня штабс-капітан Штральборн рапартамі ад 25 і 27 дня паінфармаваў губернскае кіраўніцтва аб з'яўленні на тэрыторыі Белавежскай пушчы паўстанцаў. У ноч з 23 на 24 жніўня атрад інсургентаў колькасцю болей за 500 асоб увайшоў у пушчу блізка ўрочышча Пеняжск і накіраваўся праз урочышча Гвозну да фальварка Немяржы. Спыніліся яны паміж стралецкім двароам і фальваркам, робячы з гэтага месца пошукі па розных вёсках Масеўскай сялянскай грамады. У 3 гадзіны ночы, забраўшы з сабою стралка Антона Лукшу, якога пазней днём адпусцілі, накіраваліся ў лес на поўнач ад Немяржы. Раніцай выйшлі з лесу, перайшлі раку Нарву насупраць вёскі Рудня. Сябры гэтай групы зрабілі таксама спробу нападу на стралецкі двор каля вёскі Ківачына, з канкрэтнай мэтай павесіць аб'ездчыка Завадскага і стралка Івана Глушку. Аднак пабачыўшы салдатаў паўстанцы адышлі. 27 жніўня група колькасцю 10 чалавек зноў паспрабавала павесіць Завадскага і Глушку, але забаяліся, пачуўшы, што да Ківачына набліжаецца рота расійскіх салдат.

Пасля названых падзеяў начальнік Белавежскай пушчы штабс-капітан Штральборн 28 жніўня выдаў загад аб пошуку паўстанцаў на тэрыторыі лесу і разаслаў яго па ўсіх аб'ездах. З ліку пасланых з лістом ад начальніка быў стралок Міхал Вапа. У той жа дзень у поўдзень па дарозе з Белавежы ў Гайнаўку ён быў затрыманы інсургентамі. Прачакаўшы поўны дзень і не дачакаўшыся вяртання Вапы, штабс-капітан Штральборн накіраваўся ў Гайнаўку. Там ён даведаўся, што яго загад не атрымалі і няшчасны Міхал Вапа ў Гайнаўцы не быў, хаця яго конь самастойна прыбег на пастаялы двор ва ўрочышчы Доўгі Брод.

Падчас начлегу ў Гайнаўцы Штральборна разам з капітанам Нольдэ і лясніччым падпаручыкам Кампіёні данеслі, што з лесу ў бок Гайнаўкі ідуць паўстанцы з мэтай захапіць сядзібу лясніччага. Вайскоўцы пабудзілі і паклікалі сялян, якія атачылі колам дом. Пабачыўшы сялян і салдат, паўстанцы адышлі. 30 і 31 жніўня сяляне Новабярозаўскай і Белавежскай грамадаў шукалі ў лесе цела мяркуемага забітым Міхала Вапы. Пошукі былі няўдалымі. Аднак ноччу 1 верасня ён гераічна самастойна збег ад інсургентаў з урочышча Княжага ў Арлянскіх лясах. І пасля нядоўгіх, але цяжкіх вандраванняў па пушчы з'явіўся жывы і здаровы да Штральборна. Той адразу накіраваў яго да Пружанскага ўезнага начальніка. Пры гэтым у лісце прасіў апошняга *удостоить награды Михаила Вappу, неизменившего службе в пример прочим.* Штабс-капітан Штральборн яшчэ паспрабаваў пашукаць паўстанцаў у ваколіцах Гайнаўкі, але безвынікова, бо іх ужо там не было.

Вось такая гісторыя адклалася сярод багатага збору дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне. Магчыма нам пашчасціцца ў будучым знайсці аповед Міхала Вапы пра яго затрыманне і знаходжанне ў палоне ў паўстанцаў. І мы разам з вамі даведаемся, якія выпрабаванні мусіў перажыць герой Белавежскай пушчы Міхал Вапа.

Генадзь Семянчук

Яднанне з прыродай

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Від на штучнае возера каля Крушынян

Прастора між Крушынянамі і Ласінянамі, якую калісь рупліва абраблялі нашы сяляне, ужо большай часцю запоўнена лесам. Ад дарогі між гэтымі вёскамі ў згаданы лес адыходзяць дарожкі. Даведаўся я, што некаторыя з іх вядуць да „збёрніка" з пляжам...

Маючы лішак часу рашыў я глянуць на той вадаём. Пайшоў ад Ласінян. Адышоўшы шмат за вёску пабачыў я далёка нешта накшталт высокага слупа. Калі ішоў далей мяняючы таго „слупа" азімут, інтрыгуючы аб'ект раздвоіўся, а затым паступова прыняў від двух веліканскіх крыжоў: каталіцкага і праваслаўнага. Між мною і імі паказаўся і вадаём, але да яго не было ніякіх дарожак-сцяжынак, не было і ніякіх пляжаў. З паўночнага боку маладую яловую пасадку скрупулёзна ўзаралі дзікі. Бездарожжамі дабраўся я да крыжоў. Стаяць яны на краю ўзгорка, які сёння можна назваць абрывам над аддаленым берагам, і быццам абнімаюць, быццам анёлы-ахоўнікі з двух суседніх агенцтваў бяруць пад сваю апеку ўвесь той абшар, які пакінулі ім разміграваўшыя ў гарады нашчадкі колішніх мужыкоў-паноў таго абшару...

Пры крыжах не было ніякага ахвяравальнага надпісу — чарговая загадка. Падаўся я ў Крушыняны за разгадкай. Калі адышоў мо і няцэлы кіламетр, веліканскія крыжы схаваліся ўжо за маладымі бярозавымі і хваёвымі зараснікамі.

Жыхар Крушынян, якога я спытаў пра крыжатварэнне, сказаў мне нямнога: калі тыя крыжы паставілі, асвяцілі іх бацюшка з ксяндзом, а прысутнічала пры тым гміннае і лясное начальства. Парэкамендаваў ён мне пагасіць цікавасць у тамашняга бацюшкі.

Цікавасць — першая ступенька ў пекла, прыганулася мне. Да таго ж быў Вялікі пост. У адну з ранейшых нядзель слухаў я пропаведзь, у якой святар гаварыў, што пасціць трэба не толькі ротам, але галоўным чынам языком. Калі бацюшка шчыра посціць, падумаў я, тады мне і нічога не скажа.

Пра справу выведаў я з іншых крыніц. Месца палей займаюць лясы, а месца земляробаў — леснікі. І апошніх збяднелыя жыхары тутэйшых вёсак могуць разглядаць як багацеючых захопнікаў. Таму леснікі рашылі правесці інтэграцыйныя мерапрыемствы і пачалі іх з нябеснага напрамку. Спярша дапамаглі яны пры аднаўленні наваколля крушынянскай мячэці, а следам за мусульманамі рашылі яны дагадзіць і дзвюм іншым тамашнім канфесіям — уфундавалі вось тыя два крыжы.

Вадаём на адной з тамашніх рачулак таксама збудавалі леснікі дзеля запынення вады для прыродных мэтаў: дзеля разводу птаства і звярыны. Невялікі вадаём мае таксама адыгрываць адпачынковую ролю ў Крынскай гміне, але пры скрупулёзным захаванні экалагічных патрабаванняў; нельга, для прыкладу, карыстацца на ім галосным транспартам ды і пад пляж адведзены невялічкі адрэзак берага. Астаецца яшчэ дадаць і пра супрацьпажарнае значэнне таго вадаёма.

А той рэлігійны ўхіл мае ўсведаміць навакольным жыхарам пра Боскія вытокі цэлай прыроды, пра патрэбу шанавання яе: каб не засмечваць і не забруджваць вады і лесу. Каб не рабіць са свайго асяроддзя пекла, але даглядаць яго, быццам свой райскі агародчык.

Аляксандр Вярбіцкі

Яна і ён

Седзячы за сталом, Марыя не звяртала ўвагі на словы мужа. Паглядала ў вакно на парк, які знаходзіўся на другім баку вуліцы. „Ох, зноў бы мець 20 гадоў, — уздыхнула ціха, — зноў нармальна жыць, без абавязкаў, праблемаў...Усё мінула! А цяпер што? Каструлі, абеды дзень у дзень, раскрычаныя дзеці, якія безупынна штосці просяць, і Янкавыя праблемы з грашыма, на працы. А што я магу зрабіць? Маю ўжо досыць гэтых скаргаў, плачаў! А што ж я маю ў жыцці? Недабудаваную і нявыканчаную хату! Агарод, якога ненавіджу палоць! Сватоў і бацькоў, якія ўсё знаюць лепш і 40 гадоў у сваім календары (за плячыма)". Думкі мітусліва прабягалі, а Янка гаварыў і гаварыў...

Марыя ўзяла папяросу, падпаліла, зацягнулася і выпусціла паволі дым, паглядаючы пры гэтым на мужа. „Як ён пастарэў, — падумала. — Калісь меў такія прыгожыя валасы, густыя і чорныя, якія паддаваліся маім пальцам укладваючыся ў хвалі..., а цяпер і сівізна відна. Прыгорбіўся, памужнеў крыху... але і так выглядае добра. Нават часам у магазінах жанчыны паглядаюць на яго з такой дзіўнай усмешкай... Ці адчуваю зайздрасць? — можа так, можа не... Сама не ведаю як гэта назваць — можа ганаруся? Ат, дурныя думкі!.."

Янка паглядаў на Марыю і не ведаў ужо што сказаць. „Не слухае яго? Абвінавачвае за штось зноў?! Дык жа я не маю таксама сілы каня! Не дам рады сам усяго зрабіць, не надрукую грошай! А ёй, як заўсёды, не хапае!" — думаў, п'ючы халодную ўжо гарбату.

Радыё, што стаяла на кухонным падаконніку, надавала смутныя фрагменты балладаў Сінатры і Стынга. А людзі, якія сядзелі пры стале, сужонства з 20-гадовым стажам, былі паглынуты сваімі думкамі. Зналіся ўжо 22 гады, а часам паглядалі на сябе быццам зусім чужыя асобы, не разумеючы, што гаворыць другі бок.... а можа і не хацелі ўжо зразумець?..

„Напэўна, думае зноў аб тым, што змарнаваў я яе жыццё — паглядаў ён на застылы твар жонкі — зараз напэўна скажа, што, каб не я, то працавала б яна цяпер ва універсітэце, была б вялікай паняй — доктарам ці прафесарам! А так — стала гаспадыняй! То ж гэта няпраўда! Колькі разоў я гэта ёй гаварыў. Сама выбрала, сама згадзілася. То не мая віна, што не магу знайсці работы па сваёй спецыяльнасці. Ці ж я б не хацеў лепш жыць?"

Марыя ўзняла вочы і глянула на мужа — „Ці ён сапраўды не разумее мяне? Чаму гаворыць толькі аб сваіх праблемах? А я то іх не маю? Можа думае, што калі сяджу ў хаце, то нічога не знаю? Не думаю аб нічым? Калісь магла рабіць усё! Займацца хіміяй, працаваць навукоўцам, рабіць штось карыснае! Не толькі абеды! Факт, я сама выбрала такое жыццё — дом, дзеці і яго! Але ці не магу чакаць чагось яшчэ ад жыцця? Нявартая я шчасця? — думала жанчына, прыкурваючы наступную цыгарэту. — А можа то не так? Можа грашу? Маю дом, здароўе, цудоўных дзяцей і яго — з сівымі валасамі, а з якой жа прыгожай усмешкай маладога хлопца, які думае штось змайстраваць..."

Усміхнулася і выцягнуўшы руку даткнула і далікатна пагладзіла твар Янкі. Той здзіўлена, як бы толькі што абудзіўшыся глянуў на яе з такой натуральнай пяшчотаю, далікатнасцю і пашанай.

„Мая дзяўчына — ганарыўся перад сябрамі калісь, мая нарачоная, — гаварыў бацькам, а цяпер — мая жонка! Столькі гадоў, столькі гадоў, а мінулі як адзін дзень... А я і цяпер кахаю яе. Напэўна інакш, чым на пачатку. Спакайней, лагадней, але... і часам у сэрцы жар чую, калі прытуляецца да мяне ўвечары, або калі знаходзімся дзесьці сярод людзей, дзе нельга нічога сказаць Марыя паварочвае галаву ў мой бок і глядзіць, так як толькі яна ўмее. Зпад вейкаў... а вусны складваюцца ва ўсмешку прызначаную толькі для мяне... Ах, захоўваюся як маладзён, а 50-тка недалёка...." Янка ўсміхнуўся да жонкі.

Толькі перажылі разам, успамагаючы адно аднаго, змагаліся за сваё шчасце так іншае для кожнага з іх і так супольнае, як гэтыя думкі, што паявіліся перад хвілінай. Усё будзе добра. Як заўсёды. А можа нават і лепш...

Паўліна Шафран

Веласіпедам цераз пушчу

На тэрыторыі Нараўчанскай гміны ёсць тры веласіпедныя шляхі ў Белавежскай пушчы 70-кіламетровай даўжыні.

Першы шлях, г.зв. „зялёны", 36-кіламетровай даўжыні пачынаецца ў Нараўцы і вядзе ў Масева і Альхоўку і назад у Нараўку. Пакрываецца ён з „царскай трапінай" — колішнім царскім паляўнічым шляхам.

Другі шлях, „чорны", мае 9-кіламетровую даўжыню з Нараўкі ў Грушкі ды назад над раку Гвозьну, а затым спалучаецца з „зялёным" шляхам пры складзе драўніны з царскіх часоў, названы складам Шыпулова.

Трэці шлях, „блакітны", вядзе ў Семяноўку. Там паварочвае ў Бабіную-Гару і далей уздоўж арніталагічнага шляху ў Масева. У Масеве спалучаецца з „зялёным" шляхам і даходзіць у Нараўку.

У Нараўцы можна браць веласіпеды на пракат. (яц)

Царскай трапінай

Зараз у межах ахоўнай паласы Гвозьна Белавежскага нацыянальнага парку можна карыстацца новым пешаходным турыстычным „царскім шляхам" або інакш „царскай трапінай". Вядзе шлях цераз маляўнічую, маладаступную частку Белавежскай пушчы з прыгожай прыродай. „Царскую трапіну" цераз пушчу ўзнавілі паводле старых карт і архіўных дакументаў. Немалы фрагмент шляху праходзіць гістарычнай трасай. Праклаў яго царскі атрад для аблягчэння царскай свіце вялікіх паляванняў. Яшчэ цяпер расце тут шмат дубоў, якія пратрымаліся з таго часу. Каб вясной, летам і восенню можна было прайсці сухой нагою, на дрыгвяных ды балоцістых адрэзках трасы зрабілі кладкі. (яц)

Над вадасховішчам у Рэпчычах

Май у гэтым годзе не паскупіў цеплыні і сонечных прамянёў. Хоць Рэпчыцкае вадасховішча закрытае для купання (няма адпаведнай інфраструктуры; пазычальні прылад для плавання і выратавальнай службы), але пляж, цудоўны краявід і духмянае паветра сасновага лесу вабяць турыстаў. Асабліва моладзь і школьную дзетвару. Для іх гэта сапраўдны атракцыён. Вось хоць бы зрабіць памятны здымак на фоне вадаёма з лебедзямі. Зараз іх тут дзевяць. Адкуль прыляцелі, дык цяжка сказаць. Фактам, што засталіся на пастаяннае жыхарства. Паявіліся і качкі. Над вадою можна пабачыць рыбакоў з вудачкамі. Рышард Бяловіч, перасяленец з Лодзі, які пражывае ў Гайках каля Апакі, пачаў будоўлю. Кажуць, што гэта будзе пазычальня прылад для плавання і жылыя кватэры для турыстаў. Гэта першая ластаўка агратурыстычнай базы над Рэпчыцкім вадасховішчам. Якія будуць наступныя інвестыцыі, цяжка сказаць. Спадзяюся, што ў наступным летнім сезоне жыццё ў Рэпчычах будзе бурліць.

Фота АЛІНЫ СМЫК

Кінга і Кшысь Смыкі з Беластока з чаромхаўскім брацікам Міхасём Рошчанкам

Прыехалі да мяне ўнукі з Беластока. Пакарысталіся мы нагодай наведаць Рэпчыцкае возера і пазагараць на пляжы. Варта прыехаць у Рэпчычы і прыемна правесці час.

Уладзімір Сідарук

Чытанне ў пушчы

Гмінная публічная бібліятэка (ГПБ) у Белавежы (Гайнаўскі павет) мае шматгадовую традыцыю. У ёй звыш трыццаці гадоў працуе Людміла Канэцкая, якая вельмі любіць сваю прафесію і выконвае яе з ахвотай і задавальненнем. Пазычае кніжкі для дарослых. У яе 17-тысячны кнігазбор і 410 чытачоў з Белавежы, Грудкаў, Падалянаў, Чарлянкі, Будаў, Тэраміскаў і Пагарэльцаў. У Будах, Пагарэльцах і Падалянах ліквідавалі бібліятэчныя пункты.

Для дзяцей і моладзі кніжкі пазычае Анна Дацкевіч. У яе бібліятэчным аддзеле 4 480 кніжак і 130 чытачоў.

У мінулым годзе купілі 80 кніжак ды ў першым квартале гэтага года — 65. Цяпер Гмінная бібліятэка атрымлівае менш фінансавых сродкаў на свае патрэбы, хаця кніжкі значна падаражэлі.

У 2002 годзе чытачы падарылі бібліятэцы 146 тамоў. Найбольш кніжак ахвяравалі Малгажата Красінская, Уршуля Нядзельская, Юры Доўбыш, Часлаў Аколаў, Януш Фалінскі, Міхаліна і Здзіслаў Пуцэк з Белавежы ды Аліцыя Твардоўская з Варшавы. У ГПБ да кожнай кнігі асабліва ўважлівы і беражлівы падыход. Ёсць на бібліятэчных паліцах таксама 177 беларускіх і 100 рускіх кніжак.

У гэтым годзе ў бібліятэку выпісалі адзінаццаць газет і часопісаў. Яны неабходныя, між іншым, для вядзення спецыяльных збораў — рэгіянальных пра сучасныя падзеі ў Гайнаўскім павеце і ў Белавежскай гміне, пра мясцовыя традыцыі. Ёсць у іх магістэрскія дыпломныя працы, якія тычацца Белавежы ды іншых пушчанскіх вёсак. Шмат тут папак з выразкамі артыкулаў з розных часопісаў, з гістарычнымі запіскамі, са старымі фотакартачкамі.

Цяпер чытачы наведваюць ГПБ, каб як мага найбольш даведацца пра Еўрасаюз ды што ў ім нас чакае.

У белавежскім кнігасховішчы адбываюцца культурна-асветныя мерапрыемствы, між іншым, поўныя настрою вечары паэзіі пры запаленых свечках ды шматлікія конкурсы, прысвечаныя пісьменнікам.

Найбольш чытаюць Малгажата Красінская, Люба Бушко, Галена Байко, Зіна Савіцкая, Эва і Рышард Хэнцінскія, Анна Паўлоўская, Уладзімір Паўлоўскі, Кацярына Агейчык, Марыюш Агейчык, Галіна Касцелецкая, Лех Мілкоўскі, Ірэна Казак, Юры Казак і Ян Сікорскі.

Янка Целушэцкі

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Ну і маем тую Вунію

Адгаданка

Кадзільня
(анаграмная шарада)

Такі нам час настаў, што смех і грэх,
Скандальныя навіны запаланілі свет,
І быццам ад іх ***ВЫЕ*** *мяцель у мазгаўні.*
ДУМЫ ГАНЮ *як бараноў*
і ***НЕ*** *спыняю іх,*
І ўсё ***АБ*** *цемя шэрыя таўкуць маршчыны:*
З чаго такое пекла? Няўжо
БЕЗ *дай-прычыны?*
(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне — прыказку — з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **Д-4, Б-3, А-4, Н-2, Б-5.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 17 нумара

Вуда, шуба, жыта, удаў, пуд, дзяк, Русь, Ірад, Орда.

Рашэнне: **Іскру тушы да пажару, бяду адводзь да ўдару.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Васілю Петручуку** з Беластока.

Прапанова

Я аж падскочыў на фатэлі, чытаючы „Міфы і факты"! Хтосьці ціснуў на мой дзвярны званок, як на пажар. Каго нясе?.. Можа, пісьманосец? Гэты новы, невялічкі, што паявіўся ў нашым мікрараёне перад Калядамі, у шапцы Дзеда Мароза да паштовай формы, скача па паверхах як добры заяц, тарабаніць у дзверы з поштай так, што памерлага мог бы разбудзіць. А на вуліцы сунецца як малы самаходзік, толькі тая торба бронтаецца на сцягне... Не, не лістаноша. Ці не кур'ер з вестачкай ад мае Агаты?..

На парозе стаяла прыгожая чарнявая жанчына.

Новае апытанне, ці што? Зноў будуць цікавіцца як жыву, што люблю, што купляю, а чаго не купляю? Пра пол пытацца будуць, пра ўзрост! Зоймуць гадзіну часу, а потым акажацца, што заказаў я штосьці або адразу я шчаслівы ўладальнік таннай драбязы, пераканаты, што нідзе так лёгка я нічога не выйграю! Хопіць! Не адзін я набраўся на такія нагоды, і не адзін раз. Добра, што хоць Агаты дома няма — яе лягчэй на такі грэх намовіць, пераканаць, асабліва калі ты гаваркі прыгажун або пачнеш маліць, каб набылі дурноту, бо шэф яму галаву адарве. Пашкадуй такога! А пасля такая штучка валяецца, паламаная, сярод іншага прынагодна набытага смецця.

Не, дарагая, не туды дарога!

Панечка на парозе ўсміхнулася, ды так ашаламляльна, што мне акуляры ўпалі ды рукі мае старэчыя затрэсліся. А што ж будзе, калі яна штосьці мне запрапануе?!

— Няма ў мяне часу на размовы! — выдыхнуў я з сябе на апошнім дыху і схапіўся за сэрца.

— Ох, у вас сэрца! — заўважыла мілым альтам панечка.

— Вядома ж, сэрца ў мяне, — апрытомнеў я крышку. — Вы ў якой справе? Ніякіх апытанняў, і, калі ласка, ніякіх тавараў.

— Ой, сядзьце, калі ласка, на канапу... Можа, вады вам падаць, кропель?..

— Ніякіх тавараў! — змагаўся я больш сам з сабою чым з наведвальніцай, якая, дарэчы, пашнуравала ў кухню, наліла мне кубак вады, накапала валяр'янкі (бутэлечка стаяла на відным месцы, учора Коля выпіў кілішачак пасля аднаго рамантычнага фільма, які мы разам глядзелі). Панечка села поруч мяне...

— Ніякіх тавараў!..

— Гэта больш паслугі, — усміхнулася кабетка і адшпіліла сваю сумку.

Я змахнуў з ілба кроплі поту.

— Прапаную вам...

— Нічога мне не трэба!

— Вы не ўдавец?

— Дзякуй Богу, яшчэ не, — прасоп я і схаладнеў ад пят да патыліцы. Няўжо штосьці з Агатай?! — Мая жонка ў Амерыцы...

— Дык вы, так сказаць, саламяны ўдавец.

— А ў старой печцы д'ябал паліць? — раптам мне зажартавалася. — Ці вашы паслугі не звязаны, так сказаць, з гэтым самым, секс-сервісам?

І абхапіў я панечку ў свае гарачыя абдымкі.

— Я — прадстаўніца бюро падарожжаў „Эдэм"! Знаёмцеся з нашымі буклетамі! — дама спалымнела і схапілася за сваю сумачку. Кінула мне на канапу кіпу каляровых брашур і плітанула за дзверы.

Вандал Арлянскі

Бацькаўшчына 2003

24.06 сустракаемся ўвечары на рынку ў **Мельніку**
25.06 Мельнік - Мутная - Адамова - Котэрка - Такары
26.06 Такары - Клюкавічы - Зубачы
27.06 Зубачы - Беразышча - Медзьвежыкі - Рагачы
28.06 Рагачы - Мікулічы - Дашы - Жукі - Малочкі
29.06 Малочкі - Паўлінова - Волька-Выгаеўская - Сакі - **Залешаны**

пешы рэйд беларускае моладзі

Усіх ахвотных удзельнічаць у рэйдзе просім раней скантактавацца:

basvas@o2.pl або 0501 723 652 (Ігар)

Арганізатары вяртаюць кошт падарожжа ў Мельнік – захавайце квіткі.
Не забудзьце ўзяць з сабою намёты, спальныя мяшкі й крыху граша.

БЕЛАРУСКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ СТУДЭНТАЎ

Час насаджваць хмызнякі

— Ад заўтра, дарагія мае, бярэмся насаджваць хмызнякі, — заявіў мядзведзь Сандар Жоржавіч, пачынаючы чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. — Трэба аддзячыць добрым за прыгожае.

Вавёрка Кацюша замахала кітай ад здзіўлення:

— А хто, ах, скуль, нам тое прыгожае фундануў?

— А адусюль. Тыя з поўдня панібрацяцца з тымі з захаду. А поўнач сплаўляецца з захадам, — прарочыў мядзведзь.

Для пацвярджэння дзяцел Стукач паматаў дзюбаком і трохкроць ударыў у дуб, на якім традыцыйна ў час сходаў паседжваў. Цёплалюбная лань Гаўрусіха, прадчуваючы благое, затрэслася:

— А наш улюблёны ўсходні звярынец?

— Ад усходу холад ідзе, — асцерагаў Жоржавіч. — Няма змілавання. Хмызнякі будзем вырошчваць. Абаронныя хмызнякі. Быў я на жратве ва Уладзімірскім лесе. Воўк Нятупін нават на мяне не глянуў. Штось толькі мармытаў да тых са Шварцвальда і заморскае пушчы. Хоць ведалі, што мядзведзь на пасляабедні мох, падкідалі мне нейкую зеляніну.

— Не, гэтак быць не можа, ваша велічнасць, — усё трасучыся кінула Гаўрусіха. — То ж без нашага лесу нічога быць не можа. Нічога аб нас у іх без нас, як яны самі сабе кажуць.

Дзяцел зноў тры разы ламатнуў у дуб.

— А хай сабе наша лясная брацця ставіць хмызнякі. Самі пракормімся, самі размножымся, самі абаронімся. Самі сабе будзем, — кончыў сход Сандар Жоржавіч.

З-за дрэў за палянай сходу прыслухоўваліся змяя Ссапія і вуж Ззянон.

— Хай будуюць. Га-га-га, — загагатала Ссапія.

— Хай насаджваюць. Густа-густа. Мы і так перасмыкнемся. Калі будзе патрэба — на ўсход, калі трэба — на захад. А як што, дык і на поўнач, і на поўдзень.

Ссапія пачала напяваць песню перыферыйных узлескаў, якая традыцыйна адспеўваецца дзеля падмацавання духу бязногіх гадаў.

— Нястрашны нам хмызнякі, ні мядзведжыя зубакі!

МакХолад

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***10-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Анна Раманюк і Івона Трафімюк** са Старога Беразова, **Наталля Герасімюк** з Махнатага.

ISSN 0546-1960